*Родная газета на роднай мове*

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

6 СНЕЖНЯ 2008 г.
СУБОТА
№ 231
(26344)

Кошт 500 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.



Фота БЕЛТА.

## ПАЖАР У МАГІЛЁВЕ: моцна гарэлі і доўга дымілі старыя шыны

5 снежня раніцай загарэўся сметнік аўтапакрышак каля ААТ «Магілёўскі рэгенератны завод» на вуліцы Чалюскінцаў. Сінявата-чорным дымам, які з'яўляецца пры гарэнні гумавых адходаў, зацягнула, здавалася, паўгорада.

На пажар адразу выехалі 7 разлікаў падраздзялення МНС. Плошча, на якой бушаваў пажар, складала каля 50 квадратных метраў. На пляцоўцы працавалі 49 пажарных. Яны хутка лакалізавалі пажар: збілі агонь і не далі яму распаўсюдзіцца. Але праблема была ў тым, што вышыня складзіравання старых шын дасягала 2 метраў, таму давялося разбіраць завалы. Паводле папярэдняй інфармацыі, на пляцоўцы захоўваліся 7 тысяч тон гумавых адходаў. Усяго праз гадзіну з лішкам пажар быў ліквідаваны, але пажарныя на месцы здарэння працавалі яшчэ шмат часу: масіў са спаленай гумы, які доўга тлее, трэба было разбіраць і праліваць вадой уручную.

Разглядаюцца розныя версіі ўзнікнення пажару. У пятніцу ў пахмурным Магілёве было вільготна і часам ішоў дождж, а таму версію падпалу таксама не выключаюць.

Магілёўскі народ спачатку хваляваўся: а ці не гарыць шкодныя хімічныя прадукты, а потым абмяркоўваў версіі наконт нядаўняй «таннай утылізацыі». Прычыны пажару ўстанаўліваюць спецыялісты.

Пляцоўка, дзе загарэлі старыя шыны, раней належала рэгенератнаму заводу і знаходзілася побач з ім. У сувязі з пажарам праца завода была прыпынена, работнікі эвакуяваны. Увогуле людзі на гэтым пажары не пацярпелі.

**Алена КАЗЛОВА.**

БЕЛАРУСБАНК

### Открытое акционерное общество «Сберегательный банк «Беларусбанк» информирует,

что на период с 8 декабря 2008 года по 30 апреля 2009 года по срочным банковским вкладам в белорусских рублях «Накопительный», «XXI век» (370 дней) и «Премиально-накопительный «Детский» устанавливается дополнительный процентный доход в размере 2 процентов годовых.

Процентный доход по срочным банковским вкладам в белорусских рублях на период с 8 декабря 2008 года по 30 апреля 2009 года составит:

- **«Накопительный» – 17 процентов годовых;**
- **«XXI век» (370 дней) – 15 процентов годовых;**
- **«Премиально-накопительный «Детский»** – ставка рефинансирования Национального банка Республики Беларусь + 4 п.п. + 2 процента годовых (по состоянию на 8 декабря 2008 г. **– 17 процентов годовых).**

Выплата дополнительного процентного дохода производится, если с 08.12.2008 г. по 30.04.2009 г. включительно по счетам не совершались расходные операции, кроме истребования процентов, капитализированных в вышеуказанном периоде.

Начисление дополнительного процентного дохода производится за каждый календарный день, исходя из фактического остатка суммы вклада за период с 08.12.2008 г. или дня открытия вклада после указанной даты, и причисляется к остатку вклада 30.04.2009 г.

### Предложение на заключение дополнительного соглашения к договору срочного банковского вклада (депозита) *(публичная оферта)*

Открытое акционерное общество «Сберегательный банк «Беларусбанк», именуемое в дальнейшем «Вкладополучатель», считает себя на условиях, указанных в настоящем предложении, заключившим дополнительное соглашение к договору срочного банковского вклада (депозита), определенному в соответствии с настоящим предложением, с любым, именуемым в дальнейшем «Вкладчик», кто при соблюдении условий, предусмотренных настоящим предложением, в порядке и срок, предусмотренные настоящим предложением, отзовется на настоящее предложение (акцептует предложение).

Настоящее предложение связывает Вкладополучателя с 01 мая 2009 года и может быть акцептовано в срок до момента первого опубликования извещения об отзыве настоящего предложения.

Настоящее предложение может быть в любой момент отозвано решением Председателя Правления Вкладополучателя (лицом, исполняющим его обязанности) путем опубликования извещения об отзыве настоящего предложения.

Для акцепта настоящего предложения должны быть соблюдены следующие условия:

- между Вкладополучателем и Вкладчиком действовал по состоянию на 08 декабря 2008 года и после 08 декабря 2008 года любой из нижеуказанных договоров срочного банковского вклада (депозита) в белорусских рублях: договор срочного банковского вклада «Накопительный» (в белорусских рублях); договор срочного банковского вклада «XXI ВЕК» в белорусских рублях, срок возврата вклада по которому 370 дней; договор срочного банковского вклада «Премиально-накопительный «Детский» (далее любой из названных договоров срочного банковского вклада (депозита) именуется – Договор);

- с 08 декабря 2008 года по 30 апреля 2009 года включительно по счету для размещения вклада (депозита), открытому по Договору, заключенному Вкладополучателем с Вкладчиком, никем не совершались расходные операции, за исключением истребования дохода по вкладу (депозиту), присоединенного к остатку вклада (депозита) в период с 08 декабря 2008 года по 30 апреля 2009 года.

При акцепте Вкладчиком настоящего предложения предусмотренное настоящим предложением дополнительное соглашение заключается в отношении Договора, заключенного между Вкладополучателем и Вкладчиком, в отношении которого совершается акцепт.

Акцептом настоящего предложения признается ответ любого лица о его принятии, совершенный в срок и порядке, предусмотренные настоящим предложением. Акцепт должен быть полным, безоговорочным и не может быть совершен в ином порядке, чем предусмотренный в настоящем предложении.

Акцепт настоящего предложения должен быть осуществлен путем проставления второй подписи Вкладчика на документе, оформляющем приходную или расходную операцию, при совершении приходной или расходной операции по Договору, заключенному между Вкладополучателем и Вкладчиком.

### Условия дополнительного соглашения к договору срочного банковского вклада (депозита)

С момента акцепта настоящего предложения вступает в силу Дополнительное соглашение к Договору, заключенному между Вкладополучателем и Вкладчиком (далее – Соглашение), на следующих условиях:

Вкладополучатель обязуется 30 апреля 2009 года выплатить Вкладчику путем присоединения к остатку вклада (депозита) дополнительный доход, начисленный на вклад (депозит) по Договору за период с 08 декабря 2008 года (или дня заключения Договора с 08 декабря 2008 года) по 30 апреля 2009 года включительно, исходя из фактического остатка вклада (депозита) по договору из расчета процентной ставки, равной 2 (Два) процента годовых.

При начислении дополнительного дохода по вкладу количество дней в году принимается точное (365 или 366 в високосном году).

Соглашение вступает в силу с момента акцепта настоящего предложения и применяется к отношениям Вкладополучателя и Вкладчика, возникшим с 08 декабря 2008 года.

**Председатель Правления ОАО «АСБ Беларусбанк»** **Н.А. Ермакова**

*Дополнительную информацию можно получить в любом учреждении банка или на сайте*

**http://www.belarusbank.by**

**Проценты, выплаченные по вкладам, депозитам в течение 2007 г., млн. белорусских рублей.**

| | январь | февраль | март | апрель | май | июнь | июль | август | сентябрь | октябрь | ноябрь | декабрь | 2007 г. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Вклады до востребования | 20,3 | 62,4 | 149,7 | 238,4 | 148,6 | 193,3 | 202,6 | 233,2 | 244,1 | 365,5 | 397,0 | 29 577,5 | 31 832,6 |
| в том числе: в белорусских рублях | 19,4 | 59,3 | 146,3 | 234,1 | 142,4 | 187,7 | 196,5 | 222,2 | 237,7 | 355,5 | 388,0 | 29 408,3 | 31 597,5 |
| в иностранной валюте | 0,9 | 3,1 | 3,4 | 4,3 | 6,2 | 5,6 | 6,1 | 11,0 | 6,4 | 10,0 | 9,0 | 169,2 | 235,1 |
| Срочные депозиты | 30 358,5 | 32 352,4 | 24 405,4 | 38 746,0 | 48 555,5 | 31 125,0 | 54 036,6 | 38 911,9 | 30 223,7 | 55 111,0 | 42 713,9 | 52 150,6 | 478 690,4 |
| в том числе: в белорусских рублях | 26 895,8 | 28 068,5 | 20 038,5 | 29 455,9 | 42 531,2 | 25 248,9 | 42 908,6 | 32 018,1 | 23 385,1 | 42 826,4 | 34 573,9 | 35 011,8 | 382 962,8 |
| в иностранной валюте | 3 462,7 | 4 283,9 | 4 366,9 | 9 290,1 | 6 024,3 | 5 876,1 | 11 128,0 | 6 893,8 | 6 838,6 | 12 284,6 | 8 140,0 | 17 138,8 | 95 727,6 |

**Сохранность и возврат вкладов гарантируется в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь.**

*Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 28.08.2008 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.*

# ПРАЗ 20 ГАДОЎ...

**Быццам бы і не было гэтых 20 гадоў. Але. Мы жывём у іншай краіне, і ў нас нарадзіліся і ўжо амаль выраслі дзеці. Старэйшаму сыну на наступным тыдні споўніцца 19 гадоў. А 20 гадоў таму мне было 18. І прайшло толькі 10 дзён, як мы пажаніліся. Мы пажаніліся тайна, бо мае бацькі былі супраць. У нас не было вяселля, сказалі толькі яго маці, ужо пасля рэгістрацыі, а ў яе якраз былі на вячэру пельмені. І яшчэ была бутэлька шампанскага, якую мы купілі па дарозе з ЗАГСа. І, як зараз памятаю, — бэзавыя хрызантэмы — адзіны мой вясельны букет. Дарэчы, муж мне ўсе 20 наступных гадоў больш ні разу не дарыў бэзавыя хрызантэмы. І на гэты раз, як звычайна, ён прынёс адну вялікую чырвоную ружу... Гэта было 26 лістапада. А 7 снежня ў Арменіі адбыўся землятрус. І мы спачатку слухалі навіны. І наступным днём, і праз дзень... Божа мой, гэта была першая ў нашым дарослым жыцці катастрофа! Чарнобыль не лічыцца, пра яго ў навінах маўчалі. Да таго ж Чарнобыль патрапіў яшчэ на маё дзяцінства і ценем лёг на ўсё жыццё: у верасні 1987 года нас, першакурснікаў журфака, адправілі на сельгасработы ў вёску Яноўка Краснапольскага раёна, якая пазней была «пахаваная». ...А наперадзе яшчэ былі Чачэнская вайна, Будзёнаўск, Першамайскі, «Курск», Дуброўка, 11 верасня... Не, 7 снежня 1988 года было не першай катастрофай, а хутчэй апошняй — эпохі, якая зыходзіла. Ужо «гарэў» Нагорны Карабах, вось-вось гатовае было загарэцца Прыднястроўе... Тады, у Спітаку і Ленінакане, магчыма, апошні раз сабраліся з будучых «гарачых кропак» і будучых розных краін людзі, аб'яднаныя адным агульным жаданнем — дапамагчы бліжняму ў бядзе. Яны яшчэ не ведалі...**



Мы не ведалі...

У навінах пачулі, што не хапае працоўных рук, каб разбіраць завалы, у якіх яшчэ могуць быць жывыя людзі. Гэтага было дастаткова, каб я, 18-гадовая дзяўчына, якая 10 дзён таму выйшла замуж, сказала свайму мужу: «Паехалі!» І, зразумела, ён не запярэчыў, хоць быў на 5 гадоў старэйшы за мяне. Вось толькі зараз падумала: а калі б запярэчыў, ці былі б такімі гэтыя 20 гадоў і ці з'явіліся б на свет нашы дзеці?..

Наступным днём я ўжо стаяла за білетамі ў касы «Аэрафлота» на вуліцы Карла Маркса ў Мінску. Мы ўжо сабралі рэчы: два спальныя мяшкі, надзіманыя матрацы і палатку ўзялі напракат, крупы, макароны, чамадан цёплай адзежы. Пра самае неабходнае я раілася па тэлефоне з байдарачнікам, з якім пазнаёмілася тым летам у цягніку «Адлер—Мінск», калі ехала на канікулы да бацькоў, — вось вам прыклад таго, што нічога ў гэтым жыцці не бывае выпадковым. Білет на Ерэван быў толькі на самалёт, які адлятаў з Вільнюса. У той жа дзень, праз некалькі гадзін. Грошы на білет — 90 рублёў, у нас былі, іх прыслала майму мужу цётка са Львова, як толькі даведалася ад яго маці, што мы ажаніліся. Акрамя байдарачніка, ніхто больш не ведаў пра нашы намеры. І мы выйшлі з кас «Аэрафлота» з білетамі, але без грошай. Да Вільнюса мы паспявалі даехаць на таксі, але заплаціць ужо не было чым. Я вось зараз спрабую ўзгадаць, за якія грошы мы збіраліся вяртацца, — і не магу. Няўжо мы ўвогуле пра гэта не думалі? Абодва? Але дакладна — не думалі, якія наступствы нас чакаюць за пропуск экзаменацыйнай сесіі, якая пачыналася. Мы вучыліся на адным курсе.

Таксіст пагадзіўся ўзяць у залог нашы залатыя заручальныя пярсцёнкі і прывёз нас у Вільнюс да пачатку рэгістрацыі. Пярсцёнкі — гэта было адзінае, што мы купілі да свайго вяселля. Ягоны каштаваў 80 рублёў, а мой — 70. Мы купілі іх у Маладзечне, спецыяльна паехалі на электрычцы і купілі. Вузенькія такія, самыя танныя. Таксіст, тым не менш, пагадзіўся.

У самалёце было шмат армян, у асноўным — мужчыны, усе яны былі няголеныя і маўчалі. І глядзець на іх было страшна, бо яны, як і мы, яшчэ не ведалі... Толькі ў іх ТАМ маглі быць сваякі, сябры альбо знаёмыя. У Крывым Рогу самалёт зрабіў пасадку для дазапраўкі. З будынка Крыварожскага аэрапорта мы пазванілі бацькам, яго і маім, і тым, і тым сказалі, што тэрмінова з будатрадам вылецелі ў Арменію, выратоўваць людзей з-пад завалаў. Пазванілі яшчэ аднакурсніцы і сказалі праўду, папрасілі паведаміць у дэканат.

Але самалёт да Ерэвана не даляцеў. Аэрапорт Ерэвана быў закрыты, бо падземныя штуршкі яшчэ працягваліся. Мы селі ў Адлеры. Ноччу. І я сказала свайму мужу: «Хочаш убачыць мора?». Сама я мора бачыла шмат разоў, бо мае бацькі жылі ў чатырохстах кіламетрах ад яго. І цяпер я сваё мора дарыла яму.

Мы пешшу, міма сонных прыватных домікаў з кіпарысамі і магноліямі, прыйшлі на ўзбярэжжа. Той снежаньскай ноччу мора штарміла. Яго не было бачна — суцэльная грозная цемра, якая рыкала і гула. Здавалася, што свет канчаецца ў некалькіх метрах ад тваіх ног, а далей — халодная аглушальная бясконцасць. Гэту бясконцасць я дарыла свайму мужу. Я сказала, што ён павінен абавязкова ў мора акунуцца, бо нельга ўбачыць мора і не акунуцца ў яго. Я прыхапіла шарсцяныя шкарпэткі, каб расцерці яго, калі ён выйдзе з вады. Ён распрануўся і голы пайшоў у ваду. І потым я яго расцірала шарсцянымі шкарпэткамі. Свет належаў нам дваім.

Калі мы вярнуліся ў аэрапорт, то даведаліся, што Ерэван па-ранейшаму закрыты, і наш самалёт туды не паляціць, і што для ягоных пасажыраў прапанаваны аўтобус, білет на які каштуе каля 10 рублёў. У нас іх не было. І тады мой муж упершыню ў нашым сямейным жыцці прыняў рашэнне. Ён сказаў: трэба вяртацца. І я ўпершыню яго паслухалася. Але грошай, каб вяртацца, у нас таксама не было. І ён тады стаў хадзіць сярод былых спадарожнікаў, маўклівых і няголеных, і прапаноўваць ім адзін з двух нашых студэнцкіх «Зенітаў» — між іншым, гэта быў адзін з лепшых у Саюзе фотаапаратаў. Няголеныя спадарожнікі замест адказу здзіўлена і змрочна падымалі на нас свае чорныя стомленыя вочы і нам рабілася ад іх позірку ніякавата. Нарэшце адзін з іх не вытрымаў і спытаў:

— Навошта ты прадаеш фотаапарат?

— Каб вярнуцца ў Мінск...

— А навошта ты ляцеў у Ерэван?

— Каб ратаваць людзей. Але няма грошай на аўтобус...

— Ты ляцеў ратаваць, дык рабі тое, што хацеў, — даў урок адзін мужчына другому і ўручыў нам грошы на білеты да Ерэвана.

**(Заканчэнне на 6-й стар.)**

Рэпартаж з колаў

## «ЗВЯЗДА» ТРЫМАЕЦЦА НА ЛЮБОВІ»

***(Заканчэнне. Пачатак у нумары за 5 снежня.)***

*...У Лідзе, на прыступках гасцініцы, нас сустрэў... камандзіровачны. З картай горада ён сядзеў на чамадане; ля яго тусавалася моладзь: дзяўчаты ахвотна абдымалі, садзіліся на калені — фатаграфаваліся... А што — хай з мінулага веку (мяркуючы па адзенні), хай з... бронзы, але ж мужчына. Дарэчы, пра яго, «абранзавелага», ледзь не назаўтра пасля з'яўлення, у горадзе чутку пусцілі, што гэта той пастаялец, у якога некалі джып укралі — сядзіць, маўляў, чакае, пакуль вернуць. Мы прыгледзеліся — на ўладальніка крутой іншамаркі ён не падобны, а вось на нашага брат-ка-падарожніка, якога некалі з гасцініц так часта «выганяла» шыльдаю: «Свабодных месцаў няма», — ну вельмі...*

Мы абачлівыя, мы паклапаціліся — для нас нумары былі. А вось чалавека, з якім хацелі сустрэцца, на месцы, на жаль, не заспелі — у адпачынку, сказалі, начальнік Лідскага раённага вузла паштовай сувязі Ала Мікалаеўна Віннічак, разам з якою некалі мы павезлі падпісчыкам першыя прызы, разам з якою, можна сказаць, вучыліся ладзіць сустрэчы. Ала Мікалаеўна тады вельмі дапамагла нам...

Зрэшты і цяпер, маючы вольныя хвіліны, вельмі прыемна было паназіраць за работай галоўнай Лідскай пошты, прыцаніцца да навагодніх паштовак.

На вечар быў запланаваны і яшчэ адзін «аб'ект», прычым для гэтай камандзіроўкі досыць нечаканы. Нашы падпісчыкі з Ліды, якія абслугоўваюцца ў паліклініцы Беларускай чыгункі, вельмі прасілі напісаць аб прыемных зменах, якія адбываюцца ў гэтай установе, сустрэцца з галоўным урачом. На грунтоўны агляд, на сур'ёзную размову часу, на жаль, не хапіла. Але тое, што ўбачылі — павінны прызнаць — уразіла. Не будзем пісаць, аб чысціні і парадку — яны ва ўстановах падобнага тыпу быць проста павінны... Паліклініка поўнасцю ўкамплектавана кадрамі (нават чарга на работу ёсць). У кабінетах — найноўшае абсталяванне. Прычым у кожным — розная мэбля, розны, прадуманы да драбніц інтэр'ер, з тым, каб і пацыенты, і работнікі паліклінікі адчувалі сябе камфортна... Ну вось як вам, напрыклад, лабараторыя, у якую (па вялікім рахунку)... не трэба заходзіць: каб здаць аналіз крыві дастаткова працягнуць руку ў акенца? Як вам тэлевізары ў калідорах («ніякіх канфліктаў на тэму, хто за кім. Асобныя з хворых нават прапускаюць сваю чаргу, каб нейкі сюжэт дагледзець», — зазначыў галоўны ўрач установы Віталь Іванавіч Марцінкевіч)? Як дзённы стацыянар, дзе за станам хворых вядзецца пастаяннае відэаназіранне? Як пастаянны рамонт памяшканняў, якога... ніхто, лічы, што не бачаць, бо ён робіцца сваімі сіламі — ціха і вельмі акуратна? Як выступленні гасцей — царкоўнага хору і бардаў? Не кажучы ўжо пра выключную добразычлівасць персаналу, кветкі на вокнах, люстэркі на сценах, аптэку і кнігу прапаноў тут жа, на ўваходзе...

**(Заканчэнне на 3-й стар.)**



*Работнікі СВК імя Суворава з цікавасцю разглядаюць альбом Анатоля Клешчука «Пад небам Беларусі».*

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.



***Многім жыхарам Кашалева прыносіць «Звязду» паштальён Алена ЮХНЮК.***

## Пайшоў з жыцця патрыярх Маскоўскі і ўсяе Русі Аляксій II



У пятніцу раніцай на 80-м годзе жыцця пайшоў з жыцця Патрыярх Маскоўскі і ўсяе Русі Аляксій II. Прадстаяцель Рускай праваслаўнай царквы памёр у сваёй рэзідэнцыі ў Перадзелкіне — паводле папярэдняй версіі, у яго спынілася сэрца. У апошнія гады святар пакутаваў ад ішэмічнай хваробы сэрца, перанёс некалькі інфарктаў і найцяжэйшы інсульт. У пачатку снежня ён вярнуўся з Германіі, дзе праходзіў чарговы курс лячэння. У пятніцу раніцай патрыярху стала дрэнна...

Канчаткова месца пахавання Аляксія II, а таксама імя месцаблюсціцеля Патрыяршага пасаду, які стане выконваць абавязкі да выбараў патрыярха, павінны быць названыя на экстранным пасяджэнні Свяшчэннага Сінода Рускай праваслаўнай царквы. Сярод патэнцыйных пераемнікаў кіраўніка РПЦ назіральнікі называюць чатырох кандыдатаў: Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі, Мітрапаліта Мінскага і Слуцкага Філарэта (Вахрамеева); старшыню Камісіі па кананізацыі пры Святым Сінодзе РПЦ мітрапаліта Круціцкага і Каломенскага Ювеналія (Паяркава); старшыню Аддзела знешніх царкоўных сувязяў Маскоўскага Патрыярхата мітрапаліта Смаленскага і Калінінградскага Кірыла (Гундзяева) і кіраўніка справамі Маскоўскай Патрыярхіі мітрапаліта Калужскага і Бароўскага Клімента (Капаліна). Прэзідэнт Расіі Дзмітрый Мядзведзеў у сувязі са смерцю Аляксія II адмяніў назначаны на 6 снежня візіт у Італію. Прэзідэнт Расіі заявіў, што смерць Аляксія II «з'яўляецца велізарным горам і цяжкай стратай для Расіі».

Беларуская праваслаўная царква глыбока смуткуе ў сувязі са смерцю Патрыярха Маскоўскага і ўсяе Русі Аляксія II. Аб гэтым гаворыцца ў паведамленні прэс-службы Беларускага экзархата.

## Тарыфная стаўка першага разраду ў Беларусі з 1 снежня складае Br77 тыс.

**Тарыфная стаўка першага разраду для аплаты працы работнікаў арганізацый, якія фінансуюцца з бюджэту і карыстаюцца дзяржаўнымі датацыямі, складае з 1 снежня гэтага года Br77 тыс. Такое рашэнне змяшчаецца ў пастанове Савета Міністраў № 1818 ад 29 лістапада 2008 года, якая ўключана ў Нацыянальны рэестр прававых актаў Беларусі 4 снежня пад № 5/28863.**

Пастановай урада ўстаноўлены карэкціруючыя каэфіцыенты да разлічаных па Адзінай тарыфнай сетцы работнікаў Беларусі тарыфных стаўках (акладах) работнікаў арганізацый, якія фінансуюцца з бюджэту і карыстаюцца дзяржаўнымі датацыямі, тарыфікуюцца 1-27 разрадамі ў памерах ад 2,260—0,978. Згодна з дакументам рэспубліканскім органам дзяржкіравання, мясцовым выканаўчым і распарадчым органам, кіраўнікам арганізацый, якія фінансуюцца з бюджэту і карыстаюцца дзяржаўнымі датацыямі, неабходна забяспечыць пераразлік заработнай платы работнікаў у адпаведнасці з устаноўленай тарыфнай стаўкай першага разраду і каэфіцыентамі Адзінай тарыфнай сеткі з улікам карэктуючых каэфіцыентаў.

Пастановай № 1818 прызнаецца страціўшай сілу з 1 снежня 2008 года пастанова Савета Міністраў ад 5 кастрычніка 2008 года № 1449 «Аб устанаўленні памеру тарыфнай стаўкі першага разраду для аплаты працы работнікаў арганізацый, якія фінансуюцца з бюджэту і карыстаюцца дзяржаўнымі датацыямі». Нагадаем, згодна з пастановай нумар 1449, тарыфная стаўка першага разраду для аплаты працы работнікаў арганізацый, якія фінансуюцца з бюджэту і карыстаюцца дзяржаўнымі датацыямі, была павышана з 1 лістапада гэтага года да Br91 тыс. З 1 красавіка 2008 года ў Беларусі дзейнічала тарыфная стаўка першага разраду ў памеры Br73 тыс.

**БЕЛТА.**

белагропромбанк
традиции будущего

**Открытое акционерное общество «Белагропромбанк»**

**СООБЩАЕТ, ЧТО 12 ДЕКАБРЯ 2008 ГОДА ПРОВОДИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ В ЗАОЧНОЙ ФОРМЕ**

*220036, г. Минск, проспект Жукова, 3.*

**ПОВЕСТКА ДНЯ**

***1. Об оказании безвозмездной (спонсорской) помощи.***

***2. Об утверждении Положения об Управлении внутреннего аудита открытого акционерного общества «Белагропромбанк».***

Дата составления списка лиц, имеющих право на участие в собрании, — 5 декабря 2008 года.

Акционеры банка могут ознакомиться с материалами по вопросам повестки дня по месту нахождения Правления ОАО «Белагропромбанк».

Для получения бюллетеней для заочного голосования просим обращаться в ОАО «Белагропромбанк», его филиалы, отделения по месту нахождения акционеров.

Бюллетени для заочного голосования представляются не позднее 10 декабря 2008 года.

С решениями, принятыми Общим собранием акционеров банка, можно будет ознакомиться в учреждениях ОАО «Белагропромбанк» после 21 декабря 2008 года.

**Телефоны для справок: 8 (017) 250 60 01, 228 53 00.**

КОНТАКТ-ЦЕНТР БАНКА 136

время работы 8.00-20.00 без выходных и праздничных дней;
звонок со стационарного телефона - бесплатно на территории РБ;
звонок с мобильного телефона (БеСТ, Velcom, МТС) - по тарифам операторов мобильной связи.

www.belapb.by

*Лицензия на осуществление банковской деятельности от 27.10.2006 № 2 выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551.*

ISSN 1990 - 763X

***Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 6.12.2008 г. (для б/н разлікаў)***

1 долар ЗША ................ 2 180,00
1 еўра ........................... 2 784,30
1 латвійскі лат .............. 3 925,10
1 літоўскі літ ................. 806,36
1 чэшская крона ............ 108,25
1 польскі злоты ............. 718,12
1 расійскі рубель .......... 77,60
1 украінская грыўня ...... 290,28

***Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў***

**Цэнтрабанк РФ**

USD ............ 28,0916
10 UAH ........ 35,8786
1000 BYR .... 12,9395
EUR ............ 37,4555

***Курс у гандлёвых кампаніях (на 5.12.2008 г.)***

USD ............ 2175 / 2250

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

*Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2008 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.*

*ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009*

## Прэзідэнт Беларусі адзначыў дзяржузнагародамі работнікаў прамысловасці, культуры, банкаўскай справы, ваеннаслужачых

За шматгадовую плённую працу, дасягненне высокіх вытворчых паказчыкаў, значны ўклад у развіццё культуры, адукацыі, банкаўскай справы, будаўнічай галіны, фізічнай культуры і спорту, заслугі ў воінскай службе Прэзідэнт Беларусі адзначыў дзяржаўнымі ўзнагародамі заслужаных людзей краіны. Указ аб гэтым Аляксандр Лукашэнка падпісаў 4 снежня.

Ордэна Францыска Скарыны ўдастоены артыст-вакаліст вышэйшай катэгорыі Акадэмічнага ансамбля песні і танца Узброеных Сілаў Цэнтральнага Дома афіцэраў Леанід Некрашэвіч.

Медалём «За адзнаку ў воінскай службе» ўзнагароджаны старшыя прапаршчыкі Сяргей Мамоля і Уладзімір Шышла, лейтэнант Павел Сташкевіч, медалём «За адзнаку ў ахове грамадскага парадку» — капітан Антон Далінчык.

Сярод узнагароджаных медалём «За працоўныя заслугі» — памочнік Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па пытаннях фізічнай культуры, спорту і развіцця турызму Генадзь Аляксеенка, работнікі ВА «Беларуськалій», ААТ «Полацк-Шкловалакно» і іншыя.

Медалём Францыска Скарыны адзначаны мастацкі кіраўнік Беларускай дзяржаўнай ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга філармоніі Юрый Гільдзюк, артыстка-вакалістка, вядучы майстар сцэны Беларускага дзяржаўнага музычнага тэатра Ірына Заянчкоўская, вядучыя майстры сцэны Брэсцкага тэатра драмы і музыкі імя Ленінскага камсамола Беларусі Тамара Ляўчук і Міхаіл Мятліцкі, першы намеснік старшыні Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Беларусі Аляксандр Саламаха.

Генеральнаму дырэктару ААТ «Белпрамбудбанк» Галіне Кухарэнка і начальніку філіяла гэтага банка па Магілёўскай вобласці Людміле Паўлавай прысвоены ганаровы званні заслужанага эканаміста.

Ганаровае званне заслужанага трэнера Беларусі прысвоена трэнеру-выкладчыку Мінскай спецыялізаванай дзіцяча-юнацкай школы алімпійскага рэзерву № 3 Уладзіміру Сінякевічу, ганаровае званне заслужанага будаўніка — начальніку спецыялізаванага будаўнічага ўпраўлення № 159 РУП «Трэст № 26 Жалезабетонмантаж» г. Брэста Пятру Антанюку.

**БЕЛТА.**

## Прэзідэнт заснаваў юбілейны медаль «65 год вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў»

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 4 снежня падпісаў указ аб устанаўленні юбілейнага медаля «65 год вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў». Кіраўнік дзяржавы таксама зацвердзіў палажэнне аб медалі, яго апісанне і ўзор пасведчання да яго.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## Прэзідэнт Беларусі заснаваў два нагрудныя знакі Камітэта дзяржбяспекі

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка заснаваў нагрудныя знакі Камітэта дзяржаўнай бяспекі «За выдатнасць» і «XXV год бездакорнай службы». Зацверджаны таксама палажэнні аб знаках і іх апісанні.

Адпаведны ўказ кіраўнік дзяржавы падпісаў 4 снежня.

## Падатак на прыбытак для высокатэхналагічных арганізацый з 1 студзеня будзе зменшаны ўдвая

Прэзідэнт Беларусі 4 снежня падпісаў указ № 662 «Аб падаткаабкладанні высокатэхналагічных арганізацый».

Дакументам зацверджаны пералік высокатэхналагічных арганізацый, уключаных у Рэестр высокатэхналагічных вытворчасцяў і прадпрыемстваў, прыбытак якіх, атрыманы ад рэалізацыі высокатэхналагічных тавараў (работ, паслуг) уласнай вытворчасці (акрамя гандлёвай і гандлёва-закупачнай дзейнасці), абкладаецца падаткам на прыбытак па стаўцы, зменшанай на 50 працэнтаў.

Указ уступае ў сілу з 1 студзеня 2009 года, за выключэннем некаторых пунктаў.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## Вадзіцеляў мапедаў, скутараў і іх пасажыраў у Беларусі з 1 студзеня абавяжуць надзяваць моташлемы

У Беларусі з 1 студзеня 2009 года ўводзіцца абавязак вадзіцеляў мапедаў, скутараў і іх пасажыраў удзельнічаць у дарожным руху толькі ў моташлемах. Адпаведны ўказ № 663 «Аб некаторых пытаннях удзелу ў дарожным руху транспартных сродкаў (шасі транспартных сродкаў)» кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка падпісаў 4 снежня. Такое рашэнне прынята ў сувязі са значным павелічэннем колькасці дарожна-транспартных здарэнняў з удзелам мапедаў і скутараў і ў мэтах мінімізацыі іх негатыўных вынікаў.

Дакументам таксама ўстанаўліваюцца адзіныя патрабаванні да афармлення і выдачы заводамі-вытворцамі пашпартоў транспартных сродкаў і іх шасі, а таксама прадугледжваецца выдача на іх рэгістрацыйных знакаў для транспартных сродкаў, часова дапушчаных да ўдзелу ў дарожным руху. Адзіная форма пашпартоў транспартных сродкаў і іх шасі, выдаваемых заводамі-вытворцамі, будзе зацвярджацца Міністэрствам унутраных спраў сумесна з Міністэрствам прамысловасці. Пры гэтым у выпадку самастойнага ўдзелу ў дарожным руху шасі транспартных сродкаў прадугледжаны абавязковае страхаванне грамадзянскай адказнасці іх уладальнікаў, а таксама адміністрацыйная і крымінальная адказнасць на ўзроўні, устаноўленым для вадзіцеляў транспартных сродкаў.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## Цэны панізіць!

**— загадаў новы віцебскі губернатар, які асабіста наведаў рынкі і магазіны.**

Старшыня Віцебскага аблвыканкама Аляксандр Косінец пасля таго як прайшоўся па рынках і крамах абласнога цэнтра, прыйшоў у жах ад некаторых цэнаў. Загадаў падначаленым разабрацца.

Напрыклад, цана на мяса ў аднаго гандляра — каля 13 тысяч беларускіх рублёў за кіло, а ў другога — 16... Высветлілася пасля праверкі, што высокія цэны прызначаюць індывідуальныя прадпрымальнікі. Яны, дарэчы, не абавязаныя прадстаўляць эканамічную абгрунтаванасць цаны на прадукцыю, што рэалізуюць. У Віцебскім аблвыканкаме знайшлі выйсце, як «перавыхаваць» такіх несумленных: проста будзе адмоўлена ў месцах на рынках. А замест іх будуць рэалізоўваць тое ж мяса і іншыя прадукты юрыдычныя асобы, гандляры спажывецкай кааперацыі, якія проста не могуць перавышаць вызначаныя памеры гандлёвых надбавак.

Не было межаў здзіўленню і ад цаны ў канкрэтным магазіне на віно амерыканскай вытворчасці — пад 22 тысячы за бутэльку. Аказалася, што пастаўшчык з Мінска ўжо «наварыў» на замежным віне і аб'явіў пра адпускную цану — больш за 11 тысяч. Значыць, у Віцебску прадаюць віно па цане прыкладна ў два разы больш. Губернатар даў заданне разабрацца з кожным выпадкам.

Наогул у рэгіёне з падачы губернатара аб'яўлена «прадуктовая інтэрвенцыя», што ў ліку іншага дазволіць і панізіць цэны на прадукты і тавары. Асобны прыярытэт і ў накірунку рэалізацыі айчыннай прадукцыі. Віцябчане, між іншым, запрошаныя прывезці сваю прадукцыю на перадсвяточныя кірмашы ў Мінск.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

«Прамая лінія»

## Далоў камяні... І цыстыт, і прастатыт

**17 снежня, у сераду, з 14.00 да 15.00** у рэдакцыі газеты на пытанні аб прафілактыцы і лячэнні мочакаменнай хваробы, дабраякаснай гіперплазіі прастаты, нетрымання мачы, запаленчых хвароб мочапалавой сферы — прастатытаў, піеланефрытаў, цыстытаў адкажа **загадчык кафедры ўралогіі Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, кандыдат медыцынскіх навук, прафесар Аляксандр Уладзіміравіч СТРОЦКІ.**

***Папярэднія пытанні можна пакінуць па нумарах: 8 (017) 287 18 29 (Святлана Барысенка) і 287 18 36 (Вольга Шаўко).***

«Прамая лінія»

## ПЕНСІІ: УСЁ, ШТО ВАМ ЦІКАВА

Пенсійная тэма — актуальная заўсёды. І сведчаннем гэтага становяцца званкі ў рэдакцыю, вынікам якіх стала рашэнне правесці чарговую «прамую лінію» са спецыялістамі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны. Асаблівасці падліку стажу, індывідуальнага каэфіцыента, надбаўкі, магчымасці датэрміновага выхаду на заслужаны адпачынак — аб усім гэтым і іншым мы прапануем вам пагутарыць з **намеснікам начальніка галоўнага ўпраўлення пенсійнага забеспячэння і сацыяльнага страхавання Валерыем Валер'евічам КАВАЛЬКОВЫМ.**

Наша «прамая лінія» ***адбудзецца 12 снежня з 11 да 12 гадзін па рэдакцыйных тэлефонах 8 (017) 292 38 21 і 292 38 92. Папярэднія пытанні прымаюцца па нумары 287 17 57.***

# СТУДЭНТКА... НА ДВА ДНІ

Ліст у рэдакцыю

**Хачу падзяліцца з чытачамі сваёй гісторыяй. Мяркую, што яна можа аказацца каму-небудзь карыснай. Гэтым летам я паступала ў Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт, на факультэт турызму і сэрвісу, на завочную форму навучання. Здала ўступныя іспыты, падала дакументы і стала чакаць выніку. Нарэшце па пошце прыйшло паведамленне аб маім паступленні. На канверце было ўказана маё прозвішча і ініцыялы, а вось на паведамленні — было маё прозвішча, але чужыя ініцыялы. На жаль, я нічога не западозрыла, таму што паведамленне прыйшло на мой адрас. Паспяшалася аплаціць сваё навучанне і паехала на сесію, пакінуўшы дома хворае дзіця і хворага мужа. Два дні слухала лекцыі, а на трэці дзень павесілі спісы першакурснікаў, і я заўважыла, што побач з маім прозвішчам зноў указаны не мае ініцыялы. Пайшла ў дэканат, дзе мяне «абрадавалі» — аказваецца, я не паступіла. Высветлілася, што разам са мной паступала дзяўчына з такім жа прозвішчам, але ў прыёмнай камісіі нешта пераблыталі і накіравалі паведамленне з запрашэннем на вучобу мне. Паабяцалі вярнуць грошы за вучобу, і сказалі, што такія памылкі часта здараюцца. Асабіста я лічу, што такіх памылак увогуле быць не павінна. Ці я не маю рацыю?**

**Ала МІХНЕВІЧ,** *г. Навагрудак.*

З Міністэрства адукацыі, куды быў накіраваны ліст нашай чытачкі, нам прыйшло паведамленне наступнага зместу:

«Па інфармацыі Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Я. Купалы пры паступленні на спецыяльнасць «Бухгалтарскі ўлік, аналіз і аўдыт» па выніках уступных іспытаў абітурыентка Міхневіч А.В. не прайшла па конкурсе і не была залічана ў кола студэнтаў. Але пры афармленні прыёмнай камісіяй паведамлення адбылася тэхнічная памылка сакратара. Паведамленне аб залічэнні ў кола студэнтаў было аформлена правільна — на Міхневіч Н.А. (Надзею Аляксандраўну), аднак адпраўлена яно было на адрас Міхневіч А.В. , паколькі ў базе звестак аказаліся дзве абітурыенткі з прозвішчам Міхневіч і абедзве з аднаго горада — Навагрудка. У мэтах выключэння падобных выпадкаў гэтае пытанне было разгледжана на пасяджэнні прыёмнай камісіі ўніверсітэта і на факультэце турызму і сэрвісу. Усе супрацоўнікі папярэджаны аб строгім і дакладным выкананні функцыянальных абавязкаў. Тэхнічны сакратар прыёмнай камісіі за дапушчаную памылку быў пакараны. Міхневіч А.В. прынесены прабачэнні як з боку Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Я. Купалы, так і з боку Міністэрства адукацыі. Грошы, унесеныя Міхневіч А.В. за навучанне, вернутыя».

Вось так: прынеслі прабачэнні, вярнулі грошы. Але наўрад ці гэтым можна кампенсаваць маральны ўрон, які работнік прыёмнай камісіі няхай і не наўмысна, прычыніў чалавеку. Прычым, магчыма, не толькі аднаму, паколькі невядома, а якое ж паведамленне ў такім разе атрымала Надзея Міхневіч, якая таксама, напэўна, з нецярплівасцю чакала з універсітэта радаснай навіны аб сваім паступленні? На жаль, але вельмі часта так званыя «тэхнічныя памылкі» (а за гэтым тэрмінам вельмі зручна хаваць чужую бесталковасць) могуць вельмі моцна пакрыўдзіць чалавека. А ўсім абітурыентам на будучыню ўрок — не спяшайцеся радавацца і будзьце ўважлівыя!

## На магілёўскай Саломінцы сумясцяць прыемнае з карысным

Зваротная сувязь

Улады абяцаюць, што ў магілёўскім мікрараёне «Саломінка» з'явяцца новыя гандлёвае месца і спарткомплекс. Але жыхары хвалююцца, каб не застацца пасярод новабудоўляў без міні-рынку, дзе прадаюцца тавары штодзённага попыту.

Пераўтварэнні ў Саломінцы былі сёлета ў цэнтры ўвагі магілёўскай грамадскасці. Калі ўлады аб'явілі аб рашэнні пабудаваць новы спартыўны комплекс на месцы міні-рынку «Крыніца», меркаванні людзей падзяліліся.

Адны падтрымлівалі ліквідацыю рынку, спасылаючыся на антысанітарыю і састарэлыя формы гандлю. Іншыя пратэставалі супраць закрыцця рынку і вылучалі свае аргументы: на Саломінцы набывае харчовыя і прамысловыя тавары ўвесь мікрараён, а таксама і дачнікі, бо рынак знаходзіцца на зручным месцы на выездзе з горада.

Пры гэтым усе горача віталі планы ўладаў пабудаваць сучасны спартыўны цэнтр, які вельмі патрэбен і дзецям, і дарослым. Таму народ моцна здзіўляўся: чаму нельга сумясціць прыемнае з карысным, і знайсці месца і для міні-рынку, і для спарткомплексу?

Усемагілёўская дыскусія завяршылася рашэннем пабудаваць на месцы міні-рынку «Крыніца» спартыўны комплекс, а сам рынак перанесці на іншую пляцоўку і зрабіць яго больш добраўпарадкаваным.

На сёння міні-рынак усё яшчэ працуе на звыклым месцы, але падрыхтоўчыя работы да будаўніцтва «Залы гімнастыкі» ўжо пачаліся — вакол будучай будаўнічай пляцоўкі ўсталявалі агароджу.

Гэта і стала нагодай для хвалявання магілёўскіх чытачоў «Звязды»: калі неўзабаве пачнецца будаўніцтва, дзе размесціцца мінірынак? Падобныя пытанні, дарэчы, ёсць і на сайце Магілёўскага гарвыканкама.

У гарвыканкаме карэспандэнта «Звязды» запэўнілі, што жыхары Саломінкі без харчоў і штодзённых тавараў ні ў якім разе не застануцца. Міні-рынак на старым месцы будзе працаваць па 31 снежня. А гэтым часам ідуць работы на новай пляцоўцы для міні-рынку на вуліцы Трава.

— Ужо падведзены сеткі, вада і асвятленне, — паведаміў намеснік старшыні Магілёўскага гарвыканкама Уладзімір Ціток. — У першыя дні новага 2009 года міні-рынак для жыхароў Саломінікі запрацуе на новым месцы.

— Пляцоўка будзе поўнасцю падрыхтавана да 31 снежня, а тэрміны пераезду залежаць ад прадпрымальнікаў, — сказаў яшчэ адзін намеснік кіраўніка горада Аляксандр Студнеў. — На новым мінірынку будзе зручна ўсім — гандлярам і пакупнікам. Я і сам жыву ў гэтым раёне, таму ведаю гэта дакладна.

— Падобныя хвалянні былі ў жыхароў іншага магілёўскага мікрараёна «Задняпроўе», калі некалькі гадоў таму там зачынілі вялікі рынак, — нагадаў Уладзімір Ціток. — Цяпер на месцы таго рынку стаіць сучасны гандлёвы цэнтр, дзе, напрыклад, мяса захоўваецца ў халадзільных вітрынах, дзе можна выбраць і набыць любую рэч. Змены ў гандлі на Саломінцы таксама пойдуць на карысць людзям.

Улады абяцаюць, што новы міні-рынак будзе адпавядаць сучасным патрабаванням у арганізацыі гандлю: там будуць пункты мыцця садавіны і гародніны, лабараторыя праверкі якасці харчоў, стацыянарная прыбіральня. Сама пляцоўка будзе заасфальтавана, а побач з'явіцца аўтастаянка.

Пасля пераносу міні-рынка пачнецца будаўніцтва «Залы гімнастыкі». Гэта будзе вялікі трохпавярховы будынак. І акрамя ўласна залы гімнастыкі, у комплекс увойдуць аздараўленчы і дзіцячы басейны, саўна, трэнажорная зала, касметычны салон, зала акрабатыкі. Паведамляюць, што запраектаваныя пандусы і пад'ёмнік для інвалідаў-калясачнікаў. Тэрміны завяршэння будаўніцтва спартыўнага збудавання на гэты момант невядомыя.

**Ілона ІВАНОВА.**

## Мэта — «вялікі прыход» кітайскага капіталу

2—4 снежня 2008 года ў г. Пекіне (КНР) адбылося юбілейнае 10-е пасяджэнне Беларуска-Кітайскай камісіі па гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве. Беларускую дэлегацыю ўзначальваў Старшыня Беларускай часткі Камісіі, старшыня Камітэта дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь Зянон Ломаць.

У склад беларускай дэлегацыі ўвайшлі Першы намеснік Прэм'ер-міністра Беларусі Сямашка У.І., Пасол Беларусі ў КНР Тозік А.А., Міністр энергетыкі Азярэц А.У., першы намеснік Міністра эканомікі Жабко П.К., намеснікі Міністра прамысловасці Свідэрскі Г.Б., архітэктуры і будаўніцтва Малец У. М., Першы намеснік Старшыні Дзяржстандарта Назаранка В.У. У рабоце камісіі ўзялі ўдзел кіраўнікі вядучых беларускіх прадпрыемстваў, якія працуюць у Кітаі, — ВА «БелАЗ», ЗАТ «БКК», РУП «МТЗ», ВА «Гомсельмаш», РУП «Мінскэнерга», а таксама супрацоўнікі прадстаўніцтваў беларускіх арганізацый у КНР (БелТПП, ААБ «Беларусбанк», ЗАТ «БКК», РУП «МТЗ», ВА «Гомсельмаш», РУП «МЗКТ», «Белнафтахім Шанхай трэйдынг»). Кітайскую дэлегацыю ўзначаліў Старшыня Кітайскай часткі Камісіі, намеснік Міністра камерцыі КНР Фу Цзыін. У склад дэлегацыі ўвайшлі прадстаўнікі органаў дзяржкіравання КНР, Дзяржаўнага банка развіцця, Эксімбанка Кітая, кіраўнікі вядучых кітайскіх карпарацый і кампаній, якія супрацоўнічаюць з Беларуссю.

Беларускую дэлегацыю прыняў Намеснік Прэм'ер-міністра Дзяржаўнага савета КНР Ван Цішань. У ходзе сустрэчы разгледжаны ўсе аспекты двухбаковага супрацоўніцтва. Зроблены акцэнт на неабходнасць рэалізацыі раней дасягнутых дамоўленасцяў Кіраўнікоў дзвюх дзяржаў і ўрадаў, важнасць выканання стратэгічнай ініцыятывы Прэзідэнта Беларусі аб «вялікім прыходзе» кітайскага капіталу (у тым ліку банкаўскага) у нашу краіну для выкарыстання яе ў якасці плацдарма па прасоўванні інтарэсаў КНР у Еўропе і СНД, а таксама эфектыўнай працы па ўзаемавыгадных прыярытэтных інвестыцыйных праектах.

У ходзе пленарнага пасяджэння Камісіі бакі дэталёва абмеркавалі дынаміку сацыяльна-эканамічнага развіцця дзвюх краін, стан і перспектывы беларуска-кітайскага супрацоўніцтва, у тым ліку з улікам магчымага ўплыву сусветнага фінансавага крызісу. Важнае дасягненне візіту — падпісанне пратакола аб ацэнцы адпаведнасці вытворчага абсталявання, што пастаўляецца ў рамках сумесных інвестыцыйных праектаў.

Зянонам Ломацем праведзена сустрэча з Міністрам кантролю Ма Вэнь. У членаў беларускай дэлегацыі адбыўся шэраг сустрэч і перамоў па найбольш важных практычных пытаннях беларуска-кітайскага супрацоўніцтва.

**Прэс-служба Камітэта дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь.**

## Золатавалютныя рэзервы Беларусі за студзень—лістапад скараціліся на 9 працэнтаў

**Міжнародныя рэзервовыя актывы Беларусі ў нацыянальным вызначэнні скараціліся за студзень—лістапад гэтага года на $448,8 млн, або на 9 працэнтаў, да $4544,3 млн. За лістапад яны зменшыліся на 5,3 працэнта, або на $256,6 млн, паведамілі ва ўпраўленні інфармацыі Нацыянальнага банка.**

Як растлумачылі ва ўпраўленні, скарачэнне золатавалютных рэзерваў адбылося з-за пагаршэння плацежнага балансу Беларусі, а таксама аперацый, што праводзяцца Нацыянальным банкам на валютным рынку.

У структуры міжнародных рэзерваў Беларусі на 1 снежня найбольшую ўдзельную вагу займаюць рэзервовыя актывы ў замежнай валюце ($3680,3 млн, або 81 працэнт) і каштоўныя металы і камяні ($763,2 млн, або 16,8 працэнта). За 11 месяцаў актывы ў замежнай валюце скараціліся на 9,3 працэнта, аб'ём каштоўных металаў і камянёў — на 9,9 працэнта. Іншыя актывы складаюць $100,8 млн, або 2,2 працэнта.

Міжнародныя рэзервовыя актывы Беларусі, разлічаныя па методыцы МВФ, зменшыліся за студзень—лістапад 2008 года на 9,7 працэнта, або на $406,8 млн, да $3775,4 млн. Нагадаем, што згодна з методыкай МВФ міжнародныя рэзервы Рэспублікі Беларусь вызначаюцца як высокаліквідныя замежныя актывы, якія складаюцца з манетарнага золата, спецыяльных правоў пазыкі краіны ў МВФ, рэзервовай пазіцыі рэспублікі ў МВФ і валютных рэзерваў. Яны могуць быць аператыўна выкарыстаны для правядзення інтэрвенцый на валютных рынках для стабілізацыі курсу нацыянальнай валюты, фінансавання ўрадам імпарту тавараў і паслуг, разлікаў па пагашэнні і абслугоўванню дзяржаўнага знешняга доўгу, а таксама для іншых мэтаў.

У 2007 годзе міжнародныя рэзервовыя актывы Беларусі ў нацыянальным вызначэнні павялічыліся амаль у тры разы да $4992,7 млн.

Беларусь мае намер да 2010 года нарасціць міжнародныя рэзервовыя актывы да $10 млрд.

**БЕЛТА.**

Імпрэза

## Калі спяваць — дык тое, што трэба!

**Добра, калі чалавек беспамылкова знаходзіць тое, што яму трэба ў жыцці. Музыкант і спявак Зміцер Вайцюшкевіч мала таго, што знайшоў, дык яшчэ і ўсім пра гэта расказаў. Прынамсі, раскажа на канцэрце 6 снежня ў Малой зале канцэртнай залы «Мінск», дзе адбудзецца шырокая прэзентацыя для публікі яго новага альбома «Тое, што трэба (сабранае і адабранае)».**



Але гэта не значыць, што ўсё, што было створана і праспявана раней, не адпавядала патрэбам самога Зміцера і яго прыхільнікаў. Усе яго сольныя альбомы мелі вялікі поспех і маюць да цяперашняга часу. Бо так шчыра спяваць пабеларуску можа толькі той, хто сапраўды адчувае пявучасць беларускага слова і лірызм нашай мовы. Шмат якія песні ўвогуле па-за модай і ўзростам, таму што іх можна слухаць, калі ёсць для гэтага настрой. Вось што і вылучае гэтага спевака — уменне ствараць настрой. Безумоўна, гэта тое, што ўсім заўсёды трэба.

Дарэчы, назву падказаў народны паэт Беларусі Рыгор Барадулін, з якім у сааўтарстве Зміцер стварыў альбом «Паравоз кахання». Але і да стварэння песень з новага альбома ён прычыніўся таксама, разам з іншымі беларускімі паэтамі, аўтарамі, бардамі і проста сябрамі Зміцера. Тут можна будзе пачуць нават песню «Нейра Дзюбеля» ў абсалютна новым гучанні. Выкінуў жа Зміцер і зусім неверагодны кульбіт: пераспяваў прыгажуню і супер-спявачку Ліку Ялінскую. Пагадзіцеся, чаго жанчыне і шматдзетнай маці ўжо спяваць «Чок-чок», калі гэта абсалютна не жаночая песня, якая калісьці пісалася для Уладзіміра Мулявіна.

Атрымалася месцамі сур'ёзна (жыццёвыя варункі натхняюць на творчасць), акрамя таго, і лірычна. Проста добрыя песні. А спяваць Вайцюшкевіч умее, і ў чым абсалютна не варта сумнявацца: ён робіць гэта сваім голасам.

— Калі я думаў пра тое, якім павінен быць канцэрт, то вырашыў, што гэтыя песні павінен спяваць марачок, які шмат дзе плаваў, шмат чаго бачыў. Бо розныя тэмы, розныя жанры, — гаворыць Зміцер. — Хацеў быць марачком на сцэне. Але не змог знайсці ў Беларусі формы марачка. Няма ў нашых тэатрах! Вось што значыць сухапутная краіна. Але нічога, прарвёмся. Разам са мной будзе на сцэне вядомы ўсім WZ-аркестр. Хацеў дадаць яшчэ духавую сесію, але не атрымалася. Затое ў нашай скрыпачкі Ксеніі Мінчанкі ў гэты дзень будзе дзень народзінаў...

**— Напэўна, будзе весела... І нейкія асаблівыя песні павінны прагучаць падчас канцэрта.**

— Асабіста для мяне з новага альбома асабліва песняй стала «Не губляй мяне». Гэта пераклад з французскай мовы вядомай песні Жака Брэля. Я лічу, што будзе вельмі салідна. Песня мае вялікае значэнне для мяне, як чалавека, які страчваў каханне.

А гэта таксама тое, што трэба кожнаму чалавеку. І тут магу супакоіць тых, каго апошнім часам хвалявала няпэўнасць у асабістым жыцці караля беларускага шансона і проста добрага спевака Зміцера Вайцюшкевіча. У новы год ён рыхтуецца рушыць не толькі з новымі песнямі. У наступным годзе ён чакае нараджэння дзіцяці. З якім настроем пройдзе канцэрт, як вы думаеце?

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### КОШТ НА РАСІЙСКУЮ НАФТУ — НІЖЭЙ ЗА 40 ДОЛАРАЎ ЗА БАРЭЛЬ

**Пра гэта паведаміў сайт газеты «Ведомости». Да 13.00 па маскоўскім часе кошт расійскай нафты апусціўся да 39,65 долара за барэль. На рынку FORTS на біржы РТС кошт Urals да 14.51 склаў 41,16 долара за барэль, пры гэтым мінімальнае значэнне падчас гандлёвай сесіі дасягала 40,07 долара.**

Сусветныя кошты на нафту з пачатку 2008 года практычна бесперапынна раслі і дасягнулі рэкорднай адзнакі ў 147 долараў да сярэдзіны ліпеня. Пасля гэтага нафта бесперапынна таннела і да пачатку снежня апусцілася да 50 долараў за барэль. 5 снежня на біржы NYMEX кошт нафты склаў 42,01 долара за барэль.

### РАЙС ЗАКЛІКАЛА ПРЭЗІДЭНТА ЗІМБАБВЭ СЫСЦІ Ў АДСТАЎКУ

**Дзяржсакратар ЗША Кандаліза Райс заклікала прэзідэнта Зімбабвэ Роберта Мугабэ сысці ў адстаўку.**

Паводле меркавання Райс, сусветнай супольнасці павінна быць відавочна, што цяпер для Мугабэ самы час пакінуць пасаду. Адначасова дзяржсакратар ЗША папрасіла паўднёваафрыканскія краіны аказаць на Мугабэ ціск, каб спрыяць вырашэнню палітычнага крызісу ў Зімбабвэ. Нагадаем, удзельнікі праведзенага ў кастрычніку ў Зімбабвэ саміту афрыканскіх лідараў не змаглі прымірыць Мугабэ з апазіцыянерамі.

### А СКАЗАЛА, ШТО З БТІ

У Аршанскі гарадскі аддзел унутраных спраў звярнулася па дапамогу 77-гадовая пенсіянерка, якая расказала, што яе падманула махлярка. Яшчэ ў верасні незнаёмая жанчына прыйшла да яе ў дом і патрабавала заплаціць грошы за прыватызацыю зямельнага ўчастка. Бабуля так і зрабіла — аддала 44 тысячы беларускіх рублёў. Але потым высветлілася, што ніякага дачынення да бюро тэхнічнай інвентарызацыі, супрацоўніцай якога адрэкамендавалася незнаёмка, яна не мае. Высветлілася, што на махлярства пайшла мясцовая жыхарка.

### МАЗ УРЭЗАЎСЯ Ў КАНЯ

МАЗ, якім кіраваў вадзіцель аднаго з браслаўскіх прадпрыемстваў увечары на аўтадарозе Полацк — Міёры — Браслаў у вёсцы Старыя Крукі Міёрскага раёна сутыкнуўся з гужавой павозкай, якая раптам выехала на трасу. 53-гадовы рабочы СВК, які кіраваў гужавым транспартам, ад атрыманых траўмаў загінуў на месцы ДТЗ.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## Абзац

■ Чатырохдзённае дзіця, якое выпала з акна раддома ў Бабруйску, знаходзіцца ў рэанімацыйным аддзяленні Магілёўскай абласной бальніцы. 18-гадовая маці ў раддоме ішла да акна з 4-дзённай дзяўчынкай на руках і спатыкнулася. Дзіця выпала ў акно з вышыні 4 паверха. Немаўля ў рэанімацыі, але яго жыццю, паводле сведчання ўрачоў, нічога не пагражае. Пракуратура кваліфікуе гэтае надзвычайнае здарэнне як няшчасны выпадак.

■ **Сярод лотаў аўкцыёнаў каштоўных папер, што пройдзе сёння ў Маскве — прыватызацыйны ваўчар з аўтографамі 14 чыноўнікаў. На чэку прастаўлены аўтограф Анатоля Чубайса, Ягора Гайдара, Міхаіла Задорнава, Альфрэда Коха і іншых. Кошт лота ацэньваецца ў 7,7 млн рублёў. Ваўчарная прыватызацыя праводзілася ў Расіі ў 1992—1994 гадах. Магчыма, і нашы прыватызацыйныя чэкі знойдуць такое ж прымяненне?**

■ Ваенны карабель Даніі аказаў дапамогу экіпажу судна, якое цярпела бедства ва ўмовах дрэннага надвор'я ў Адэнскім заліве. Як мяркуецца, гэты карабель належыць піратам. Аперацыя па выратаванні людзей з карабля была ажыццёўлена пасля атрымання сігналу аб бедстве, як таго патрабуюць міжнародныя законы. На судне былі выяўлены ўзоры зброі, падобнай на тую, якую выкарыстоўвалі піраты пры захопе іншых караблёў. Пасля паспяховага правядзення аперацыі было прынятае рашэнне аб знішчэнні судна. Ва ўмовах дрэннага надвор'я яго немагчыма было ўзяць на буксір, і яго было знішчана ў інтарэсах суднаходства. Асобы, якія падазраюцца ў пірацтве, перададзены ў праваахоўныя органы.

■ **Ювелірны магазін у Парыжы абрабаваны на суму 50 млн еўра. У магазін, што размешчаны непадалёк ад Елісейскіх палёў, уварваліся трое ўзброеных людзей, пад дулам пісталета забралі амаль усю калекцыю ўпрыгажэнняў і зніклі. Гэта адно з самых буйных рабаванняў у Францыі на працягу апошніх дзесяцігоддзяў. Расследаваннем займаецца аддзел па барацьбе з бандытызмам.**

## Поўны абзац

■ Французы маюць намер пачаць кланіраванне вядомага далікатэсу — чорных труфеляў, адзін кілаграм якіх на рынку каштуе каля 1300 долараў ЗША. Такая мера абумоўленая скарачэннем ураджайнасці грыбоў. Калі ў пачатку XX стагоддзя ў Францыі штогод збіралася 1000 тон «чорных алмазаў», то цяпер — ад 40 да 50 тон. Плануецца, што кланіраваныя труфелі будуць некаторы час вырошчваць у лабараторыях разам з маладымі дрэвамі, у каранях якіх яны растуць. Як толькі грыбы прыжывуцца да дрэваў, сфарміраваную пару будуць высаджваць у натуральны прыродны асяродак.

■ **У Афрыцы на міжземнаморскім узбярэжжы Марока выпаў моцны снег. Толькі за суткі вышыня снежнага покрыва склала 20—40 см. Дарогі абледзянелі. У некаторых раёнах перапыненая падача электраэнергіі, парваная тэлефонная сувязь, часова адменены аўтобусныя рэйсы. Тым не менш многія мараканцы і турысты сустрэлі снег з вялікай радасцю: снегапады ў Афрыцы — вялікая рэдкасць. Прыродная анамалія дала магчымасць афрыканскім жыхарам пагуляць у снежкі, зляпіць снегавікоў і нават пакатацца на лыжах.**

■ Жыхар горада Кейп-Корал у ЗША прымусіў свайго 9-гадовага сына адвезці яго ў магазін па піва, паколькі сам быў моцна п'яны. Машыну тым не менш спынілі паліцэйскія. Яны выявілі ў салоне, акрамя маленькага вадзіцеля, двух добра падпітых мужчын — бацьку хлопчыка і яго сябра, а таксама скрыню піва. Бацька быў арыштаваны, а затым адпушчаны пад заклад. Наперадзе — суд.

*СПК «Орлы», д. Большие Орлы, Столинский район*

**ПРОВОДИТ ПРОЦЕДУРУ ЗАПРОСА ЦЕНОВЫХ ПРЕДЛОЖЕНИЙ**

**на поставку дизельного автопогрузчика г/п 1,5 тонны.**

**Предложения принимаются до 15.12.2008 года по адресу: 225543, Брестская обл., Столинский р-н, д. Большие Орлы или по факсу 8(01655) 77 2 21.**

УНП 200114871

*По поручению комиссии по работе с имуществом, обращенным в доход государства, при Воложинском райисполкоме КУП «Минский областной центр учета недвижимости»*

**ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

по продаже обращенного в доход государства здания столовой, об. пл. 686,9 кв.м, расположенного по адресу: Воложинский район, д. Гончары. Начальная цена снижена на 20 % и составляет – 145 601 550 бел. руб. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 15.05.2008 г. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **23.12.2008 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, ком. 321. Заявление на участие и необходимые документы принимаются по **22.12.2008 г.** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, ком. 326.

**Контактный телефон (8 017) 224 61 34. Наш сайт в интернете: www.rlt.by.**

УНП 690324015

**Ивенецкий поселковый исполнительный комитет Воложинского района Минской области (Продавец)**

**ПРОВОДИТ ПОВТОРНЫЙ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

по продаже 2 (двух) земельных участков для индивидуального жилищного строительства:

**Лот 1** — земельный участок № 3, кадастровый номер **622055400064000003** по адресу: г.п. Ивенец, ул. Ивенецкая, площадь участка 0,1914 га, начальная стоимость 2 392 500 белорусских рублей; **Лот 2** — земельный участок № 10, кадастровый номер **622055400064000001** по адресу: г.п. Ивенец. ул. Ивенецкая, площадь участка 0,1520 га, начальная стоимость 1 900 000 белорусских рублей.

Целевое назначение земельных участков — строительство и обслуживание жилого дома. По улице Ивенецкой имеется в непосредственной близости газ и центральное водоснабжение.

Продажа земельных участков производится гражданам Республики Беларусь, постоянно проживающим на территории республики или приравненным к постоянно проживающим в соответствии с законодательными актами Республики Беларусь. Задаток в размере 10 % от начальной цены перечисляется на р/с 3600614020009 в филиале № 605 МОУ «АСБ Беларусбанк» код 513, г. Воложин, ул. Партизанская, 13, назначение платежа 04901, УНП 600037277, ОКПО 04432328, Ивенецкий поселковый исполнительный комитет. Оплата за объект аукциона должна быть осуществлена в течение 10 рабочих дней со дня получения протокола о результатах аукциона. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **17 декабря 2008 г.** в 15.00 по адресу: г.п. Ивенец, пл. Свободы, 2, 2-й этаж, зал заседаний. Заявления на участки и необходимые документы принимаются до 17.00 **15 декабря 2008 года** по адресу: г.п. Ивенец, пл. Свободы, 2, кабинет секретаря.

**Контактные телефоны: 8 01772 53 367, 53 587.**

*КУП «Минский областной центр учета недвижимости» по поручению Петришковского сельисполкома Минского района*

**ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов:

| № лота | Адрес земельного участка, кадастровый номер | Площадь земельного участка | Наличие инженерных сетей | Расходы по подготовке документации (рублей) | Начальная цена (рублей) | Задаток (рублей) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | аг. Петришки, участок № 82 623685707601000141 | 0,1479 га | сети электро-, газо-, водоснабжения | 70 000 | 14 547 500 | 1 450 000 |
| 2 | д. Новашино, 623685707101000236 | 0,2016 га | сети электроснабжения | 70 000 | 13 696 500 | 1 350 000 |
| 3 | д. Новашино, 623685707101000141 | 0,1635 га | | 70 000 | 11 108 000 | 1 100 000 |
| 4 | д. Новашино, 623685707101000143 | 0,1622 га | | 70 000 | 11 019 700 | |

Задаток перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», г. Минск, МФО 153001357, УНП 690324015, КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок и возместить расходы, связанные с подготовкой документации. Все желающие могут ознакомиться с документацией и земельными участками. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **13.01.2009 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, д. 5, ком. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **08.01.2009 г.** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, д. 5, ком. 326.

**Контактный телефон (8 017) 224 61 34. Сайт в интернете: www.rlt.by.**

*КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015.*

# ПРАЗ 20 ГАДОЎ...

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

Напэўна, мы ехалі суткі. Я памятаю мандарынавыя сады Абхазіі і прыдарожную кавярню ў Грузіі, дзе мы купілі кураня-табака, да якога падалі лаваш і пук зеляніны. Нічога смачнейшага я больш не ела. А ў Арменію мы ўехалі ноччу. Я не ведала, ад чаго прачнулася, бо ніякіх гукаў не было: усе, не адрываючы вачэй, глядзелі ў вокны: мы праязджалі Спітак. Тое, што ад яго засталося, было ні на што не падобным. На шэрым досвітку праступалі пакрытыя шэрым пылам горы будаўнічага смецця. Замест горада. Мяне разбудзіла адчуванне жаху, якое бязгучна напоўніла салон аўтобуса. Здаецца, я з палёгкай адзначыла для сябе, што ў Спітаку ніхто не выходзіў...

У Ерэване нас запрасіў да сябе той самы армянін, які даў грошы на аўтобусны білет. Яго імя — Фрунзік, у 1988 годзе ён меў у Мінску маленькую кавярню-марожанае, а сям'я яго жыла ў сталіцы Арменіі. У Фрунзіка мы пераначавалі, пакінулі чамадан з цёплымі рэчамі і раніцай наступнага дня паехалі на аўтобусе ў Ленінакан.

На плошчы Ленінакана стаялі вялікія салдацкія палаткі з «буржуйкамі». Мы знайшлі пустую і спыніліся ў ёй. Перад плошчай стаяў напаўразбураны універмаг, шматметровыя алюмініевыя канструкцыі якога нагадвалі паламаны веер. Абапал вуліц выстраіліся штабялі парожніх трунаў розных памераў, у тым ліку дзіцячых. Яны былі змешчаны адна ў адну, як парожнія шклянкі, і побач, прыхінутыя да будынкаў — вечкі. Іх было так шмат, што ўжо праз некалькі хвілін мы да іх прывыклі, як да нечага звычайнага, на імгненне мільгала ў галаве думка: «Жах у тым, што ты ставішся да жаху як да нечага звычайнага» — і знікала. Абарончыя сілы маладога арганізма перамагалі.

Там быў штаб, які размяркоўваў добраахвотную працоўную сілу. Я трапіла ў медчастку, а мой муж — на разбор пяціпавярховага дома. Я падкладала да рук і ног параненых людзей грэлкі і мыла падлогу, а ён з іншымі мужчынамі спяшаўся за кароткі светлавы дзень зменшыць вялізную, на ўзроўні трох паверхаў, кучу з бетону, кавалкаў мэблі і фотаздымкаў, на якіх смяяліся людзі і рабілі першыя крокі маленькія дзеці... Калі надыходзілі прыцемкі, тым, хто працаваў, здавалася, што куча не зменшылася ні на сантыметр. У перапынках паміж сваімі заняткамі я прыходзіла да мужа і глядзела на пяціпавярховы дом, які стаяў побач, але паловы яго не было, частка дома была быццам адрэзаная нажом, былі бачныя пакоі з мэбляй, якая яшчэ стаяла на сваіх месцах, з дзвярыма і вокнамі, з гадзіннікамі і адрыўнымі календарамі на сценах. Гэта была фантастычная карціна — проста нерэальная. Так робяць цацачныя домікі, каб дзецям зручна было перастаўляць у пакоі фігуркі і прадметы. Але цацачныя не бываюць у пяць паверхаў...

Аднойчы я прыйшла ў медчастку і пачула крык. Крычаў мужчына. Ён прыйшоў апазнаць жонку. Яго пыталіся пра прыкметы, пра пярсцёнак на руцэ... Ён кідаўся і крычаў, і не зразумець было, ці то ён пазнаў яе, ці то не. І тут я ўбачыла фотаздымак, на якім яны былі ўдваіх. Фотаздымак быў свежы, але на ім былі маладыя мужчына і жанчына, а перада мной кідаўся і крычаў стары.

Увечары муж сказаў, што да іх прыходзілі замежныя выратавальнікі з сабакамі, каб высветліць, ці ёсць яшчэ пад заваламі жывыя людзі. Але з упэўненасцю нічога не сказалі. Ды і перакладчыка з імі не было. Мы былі ў адчаі ад таго, што не хапала кранаў і пражэктараў, каб можна было працягваць работу і пасля заходу сонца. На трэці дзень яны раскапалі мёртвую цяжарную жанчыну. Я яе не бачыла, я бачыла толькі, як ад'язджала грузавая машына, а з яе кузава тырчала ў неба рука.

На чацвёрты дзень мы паехалі на гарадскія могілкі. Мы ўзялі фотаапараты, але не маглі здымаць. Другакурснікі, мы яшчэ не былі настолькі сапсаваныя прафесіяй, каб фатаграфаваць гора. Калі шчыра, тады я перажыла своеасаблівы крызіс: я ўзненавідзела сваіх братоў-журналістаў, якія, я разумела, тут проста зараблялі грошы (мне здавалася, што я бачыла, як блішчаць іх вочы).

Мы ехалі за горад на грузавой машыне, разам з некалькімі мужчынамі і труной. Ля труны сядзеў і плакаў падлетак, нам сказалі, што гэта яго маці. Могілкі складаліся з дзвюх частак — індывідуальных магіл і адной агульнай, якая ўяўляла сабой доўгі роў. У гэтым рове стаялі не закалочаныя труны. У іх былі тыя, каго не апазналі альбо каго не было каму апазнаваць. Сюды прыходзілі ў пошуках сваякоў, адцiскалі вечкі і глядзелі. Роў не засыпалі. Вечка адной труны дрэнна прыкрылі, і я ўбачыла частку лба і пафарбаваныя валасы жанчыны, напэўна, маладой. І зноў адчуванне рэальнасці пакінула мяне. Тое, што я ўбачыла, было так падобна на ляльку, што я не магла паверыць, што гэта — мёртвы чалавек.

Там было шмат студэнтаў і шмат добраахвотнікаў, падобных на нас. Да нас у палатку пасяліліся дзве дзяўчынкі з кішынёўскага тэхнікума. У медчастцы студэнты пілі спірт і змрочна жартавалі наконт верагоднасці распаўсюджвання чумы. Мы знайшлі землякоў-беларусаў, яны сустрэлі нас, як родных, пачаставалі згушчаным малаком. Не менш сардэчна нас прынялі армавірскія армяне — мае землякі, тут нас накармілі духмяным кубанскім баршчом. З ежай праблем не было. Усім жадаючым на вуліцы з машын раздавалі сухі паёк, хлеб і мінеральную ваду. Дзяўчаты з Кішынёва неяк зварылі нам з кансерваў суп. Але запомніла я менавіта згушчонку і боршч. Дарэчы, ленінаканскую згушчонку ўзгадваю кожны раз, калі даводзіцца не адкрываць банку цалкам, а рабіць дзірачку і выцягваць адтуль малако. Малако было наша, беларускае, а вось этыкетка нейкая нязвыклая («экспартная» — мне патлумачылі), ды і смак быў непаўторным. Буржуйку мы палілі кавалкамі мэблі з суседніх дамоў. Неяк муж прынёс рэшткі гітары, але так і не рашыўся кінуць іх у агонь.

Там, у разбураным Ленінакане, адбылася першая наша сямейная сварка. Не памятаю, з-за чаго, але, як і «павінна быць», пакрыўджаная, я пайшла з дому — гэта значыць, з нашай палаткі. Электрычнасці ў горадзе не было, і я ішла ў цемры ад аднаго вогнішча да другога. Не далёка адышла, бо страшна было. Мяне паклікалі да сябе нейкія ці то вайскоўцы, ці то міліцыянеры, якія ахоўвалі, як яны сказалі, магазін ад марадзёраў. Яны запрасілі мяне да сябе на агеньчык, прапанавалі каньяк, сказалі, што гэта — лепшы сродак прафілактыкі чумы. Я трошкі выпіла і адразу падумала, што бедны мой муж недзе застаўся без прафілактыкі. Я расказала вайскоўцам пра мужа, на ўсялякі выпадак схлусіла, што ён побач і калі крыкнуць, то прыйдзе. Тады яны прапанавалі мне імпартныя мужчынскія падцяжкі з крамы, сказалі, што там увогуле шмат цікавых рэчаў. Раптам мне стала моташна, падалося, што той саладкаваты пах, які з кожным днём узмацняўся ў горадзе, тут, побач з гэтымі людзьмі, якія прапануюць мне імпартныя падцяжкі і намякаюць на іншыя дэфіцытныя рэчы з разбуранай крамы, стаў проста нясцерпным. Я паднялася і хутка, нягледзячы на ўгаворы застацца, пайшла да свайго перапужанага за мяне мужа.

Прыкладна на пяты дзень нашага прыезду пачаўся масавы выезд людзей з горада. Знайсці жывых ужо ніхто не спадзяваўся, а значыць, неабходнасці ў нашых працоўных руках не было. А вось пагроза эпідэміі нам здавалася рэальнай. Дзяўчынкі з Кішынёва вырашылі застацца (яны прыехалі на некалькі дзён пазней за нас), а мы раптам з цьмянай трывогай узгадалі пра сваю экзаменацыйную сесію і сабраліся дадому.

Выехаць аказалася не проста. З першага погляду — не з-за грошай. Нам, як усім жадаючым, далі даведку, у якой пазначалася, што мы падчас землятрусу знаходзіліся ў Ленінакане і таму маем права без дакументаў і бясплатна перамяшчацца ў любы пункт Савецкага Саюза і на любым відзе транспарту. На аўтобус нерэальна было патрапіць на працягу яшчэ некалькіх дзён — столькі на яго было жадаючых. І таму мы разам з яшчэ двума мужчынамі селі на таксі. Я — наперадзе, мой муж і нашы спадарожнікі — на заднім сядзенні.

Ленінакан знаходзіцца ў 126 кіламетрах ад Ерэвана. Вадзіцелем таксі быў тоўсты прадпрымальны грузін. Тое, што ён прыехаў сюды, каб падзарабіць, я зразумела, калі нашы спадарожнікі папрасілі іх

> **Абапал вуліц выстраіліся штабялі парожніх трунаў розных памераў, у тым ліку дзіцячых. Іх было так шмат, што ўжо праз некалькі хвілін мы да іх прывыклі, як да нечага звычайнага, на імгненне мільгала ў галаве думка: «Жах у тым, што ты ставішся да жаху як да нечага звычайнага» — і знікала.**

высадзіць на палове дарогі. Вадзіцелю гэта страшна не спадабалася, ён нават выйшаў з машыны і схапіў аднаго з пасажыраў за грудкі. Ён гучна нешта крычаў на сваёй мове, тым не менш, я здагадалася пра сэнс яго слоў і не на жарт спужалася. Калі гэты чалавек гатовы біцца з двума мужчынамі, якія заплацілі яму палову ад таго, што ён чакаў, што ён зробіць з намі, хударлявымі немясцовымі студэнтамі, якія не збіраюцца яму плаціць увогуле?!

Адно я ведала цвёрда. Пакуль мы не прыедзем у людную мясцовасць, дзе нас складана будзе забіць, наш вадзіцель не павінен ведаць праўду пра нашу плацежаздольнасць. Увесь астатні шлях я імкнулася выклікаць прыхільнасць таксіста да нас з мужам. Я пачала здалёк. Расказала, што ў нас мядовы месяц. Пра Мінск расказала, пра Беларусь. Ён ведаў Беларусь і Мінск, асабліва Камароўку, бо гандляваў там ботамі. Тады я расказала пра наша студэнцкае жыццё, пра тое, як мы пазнаёміліся, пажаніліся, як даведаліся пра землятрус. Расказала пра тое, што рабілі ў Ленінакане, а па меры таго, як мы набліжаліся да Ерэвана, я ўсё бліжэй даходзіла ў сваім аповедзе да Фрунзіка, які даў нам грошы на аўтобусны білет, і да даведкі, па якой мы можам цяпер бясплатна вярнуцца ў Мінск... Ужо вакол былі дамы, мы ўязджалі ў горад, калі наш кіроўца быццам перастаў дыхаць. Я ацаніла сітуацыю, з палёгкай заўважыўшы, што калі трэба будзе выскокваць на хаду, то шанц выратавацца ў нас ёсць.

Нарэшце таксіст, не паварочваючы галавы, і не пачаўшы дыхаць, задаў пытанне:

— А ў Ерэване вам куды трэба?

— Мы некаторыя рэчы пакінулі ў Фрунзіка, — мы назвалі вуліцу, — а потым нам трэба ў аэрапорт...

І тут грузін засмяяўся. Прычым ён так смяяўся, што дыхаць на некалькі хвілін перастала я. З ім проста здарылася істэрыка. Ён раскачаўся ўсім сваім вялізным тулавам і біў рукамі па рулявому колу. А потым супакоіўся, выцер вочы і перапытаў адрас Фрунзіка. Праўда, пакуль муж мой бегаў па рэчы, таксіст спрабаваў угаварыць мяне з'ехаць з ім у Тбілісі, абяцаў цудоўнае жыццё, але я ветліва адмовілася, спаслаўшыся на моцнае каханне да мужа (Божа, як я ў думках малілася, каб гэты самы муж хутчэй вярнуўся!). Потым ён давёз нас да аэрапорта і яшчэ даў пяцёрку, каб мы перакусілі.

І мы, сапраўды, па сваіх даведках даехалі з перасадкай у Кіеве да Мінска. Мы былі вельмі стомленыя, брудныя, ад нашых рэчаў ішоў моташны саладкаваты пах. Я ведала, што гэта за пах. Цяпер мне чамусьці хацелася плакаць. І хацелася спаць у ложку з чыстай бялізнай. І здавалася гэта недасягальным. А тым часам мае бацькі даведаліся ў дэканаце, што іх дачка паехала ў Ленінакан не з будатрадам, а з уласным мужам. І мяне чакала цяжкая размова і ўвогуле няпросты перыяд у адносінах з імі, які, цяпер, на шчасце, мінуў.

Экзаменацыйную сесію мы тады здалі, журфак потым скончылі, і ўжо праз год пасля ўзгаданых падзей у нас нарадзіўся першынец. 20-годдзе нашага вяселля мы адзначалі сціпла. Зноў фінансавыя цяжкасці, канешне, часовыя, і трошкі пазней мы, мабыць, сходзім у нейкі рэстаран. Галоўнае ж не ў гэтым, а ў тым, што мы пакуль разам. Калі шчыра, я вельмі хачу, каб так было заўсёды. Заручальныя пярсцёнкі мы, дарэчы, выкупілі. А вось ні з Фрунзікам, ні з дзяўчынкамі з Кішынёва і ні з кім іншым ні разу так і не сустрэліся. Ні разу мы больш не былі і ў Арменіі. А хочацца. І за кураня-табака з грузінскай прыдарожнай кавярні я шмат аддала б.

**Ленінакан, другі па велічыні горад Арменіі, з 1991 года стаў называцца Гюмры. Аказваецца, ён вельмі старажытны, яго ўзгадваў яшчэ ў VII стагоддзі да нашай эры грэчаскі военачальнік Ксенафонт. У мяне ёсць мара — патрапіць туды. Убачыць, як ён аднавіўся. Прайсціся па яго вуліцах, пастаяць на плошчы, паглядзець у светлыя твары яго жыхароў. Упэўніцца, што ўсё добра. Мне здаецца, што калі б туды нейкім неверагодным чынам сабраліся тыя, хто быў там 20 гадоў таму, тыя, хто аказаўся за гэтыя гады праз мяжу і нават праз некалькі межаў адзін ад аднаго, то нешта тады б здарылася вельмі добрае. Нейкае кола замкнулася б. Нешта цяжкае, няправільнае, тое, што раз'ядноўвае, скончылася б. Справа ж не ў межах, не ў назвах краін, не ў тым, што называецца палітыкай. Ёсць нешта вышэйшае за ўсё гэта, і яно яднае людзей, яно робіць усіх сапраўды блізкімі. Сэрца?**

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

**P.S.** Землятрус у Арменіі 1988 года лічыцца самым буйным у гісторыі Каўказа. Ён унёс жыцці больш за 25 тысяч чалавек. Пасля нашага ад'езду, на 17 суткі пасля землятрусу, у завалах былі знойдзены яшчэ два жывыя чалавекі.



Ленінакан, снежань 1988 г.

# POST factum

## Спрыяльны час для Абамаў

**Для амерыканцаў з прозвішчам Абама надышлі добрыя часы — як аказалася, ім нават можна беспакарана парушаць правілы дарожнага руху.**

Як піша газета Telegraph, нейкі Ніканор Абама, аўтамабіліст з Вашынгтона, якога спыніў інспектар дарожнай паліцыі за хуткую язду, быў адпушчаны і нават не атрымаў штрафу.

Паліцэйскі, зірнуўшы на вадзіцельскае пасведчанне затрыманага, толькі ўсміхнуўся. Ён не стаў караць вадзіцеля, сказаўшы, што прабачае яму ліхацтва на дарозе, але толькі таму, што ён — цёзка новаабранага прэзідэнта ЗША.

28-гадовы Ніканор Абама расказаў выданню, што, дзякуючы свайму прозвішчу, патрапіў нядаўна ў начны клуб зусім бясплатна. А калі ён прыйшоў у бальніцу наведаць сваю стрыечную сястру Жазэфіну і назваў на ўваходзе прозвішча сваячкі, у прыёмнай з захапленнем выгукнулі: «Абама!? Яна — адна з членаў прэзідэнцкай сям'і, і яна тут?».

У адрозненне ад Ніксана, Клінтана ці Буша, амерыканцаў з прозвішчам Абама налічваецца ўсяго 69 чалавек. Большасць з іх, як кажуць, сягаюць каранямі ў Экватарыяльную Гвінею, а некаторыя — з Японіі, краіны, дзе ёсць горад з назвай Абама. Шматлікія жыхары ЗША, як паказала апытанне, рады новаму прэзідэнту. «Я такая задаволеная абраннем Барака Абамы! Мне даводзілася вельмі нялёгка са сваім прозвішчам, якое асацыявалася ва ўсіх з Асамай бэн Ладэнам», — кажа, напрыклад, Сюзі Абама, агент па нерухомасці ў Фларыдзе.

## Каты гуляюць... з фотакамерамі



**Сапраўдным хітом брытанскага інтэрнэта сталі спецыялізаваныя веб-сайты, на якіх публікуюцца фотаздымкі, «зробленыя» катамі. Іх стваральнікі не толькі атрымалі ўсеагульнае прызнанне ў Вялікабрытаніі, але і маюць з гэтага неблагі прыбытак...**

Многія брытанцы адпускаюць вечарамі сваіх катоў і сабак пагуляць па вуліцы. Для гэтага ва ўваходных дзвярах некаторых дамоў зроблены спецыяльныя адтуліны. Ідэя надзець на шыю кошцы лічбавы фотаапарат прыйшла адной з жыхарак паўночнага Лондана. Жанчына была заінтрыгавана тым, дзе гуляе начамі яе кот Сарці. Невялікі апарат, які аўтаматычна робіць адзін фотаздымак кожныя 30 хвілін, жанчына прымацавала да ашыйніка кошкі. З таго часу не толькі яна, але і ўся Вялікабрытанія ведае, дзе гуляе і чым займаецца на начных вуліцах Лондана кот Сарці. Фота, зробленыя ў час начных прагулак, атрымалі вялізную папулярнасць, і іншыя ўладальнікі катоў і сабак пачалі навешваць на ашыйнікі сваіх гадаванцаў фотаапаратуру.

Зараз у брытанскім інтэрнэце існуе некалькі дзясяткаў веб-сайтаў, праз якія ідзе абмен падобнымі фота. Як аказалася, каты вядуць у вялікім горадзе цікавы лад жыцця. Так, працяглы час яны праводзяць, пазіраючы на неба, быццам іх вельмі цікавяць зоркі. Фотаздымкі катоў прымушаюць па-новаму, новымі вачыма, зірнуць на тое, што нас акружае — многія фота зроблены ў такіх нечаканых ракурсах, што могуць стаць шэдэўрамі сучаснага мастацтва. Многія гаспадары такіх «работ» ужо задумваюцца аб правядзенні фотавыстаў сваіх вусатахвастатых гадаванцаў.

## Скарб смецця



**Жыхар Вялікабрытаніі знайшоў у смеццевым баку 15 тысяч фунтаў стэрлінгаў. Праўда, для таго, каб іх атрымаць, Грэхему Хілу давядзецца сабраць вельмі складаную мазаіку.**

Містэр Хіл, які працуе ў гарадской камунальнай службе і займаецца вывазам смецця, паўгода назад падчас работы знайшоў у адным са смеццевых бакаў вялікі мех з купюрамі ў 10 і 20 фунтаў стэрлінгаў. Усе грошы ў пакунку (увогуле там было каля 15 тыс. фунтаў) былі разрэзаныя на дробныя кавалачкі, паведамляе газета The Guardian. Каштоўную знаходку Хіл, як сумленны грамадзянін, аднёс у паліцыю.

Але праваахоўныя органы так і не змаглі выявіць уладальніка меха з грашыма або звязаць купюры з якім-небудзь злачынствам. «Я думаю, яго паходжанне назаўжды застанецца загадкай», — адзначыў паліцэйскі. Таямнічы пакет быў вернуты Хілу.

Зараз смеццезборшчыку трэба будзе сабраць самы вялікі пазл у сваім жыцці. Банк Брытаніі пагадзіўся абмяняць парэзаныя купюры на цэлыя толькі ў выпадку, калі ўладальнік зможа скласці з абрэзкаў кожную банкноту ў яе першапачатковым выглядзе. Тым не менш, калегі Грэхема не сумняваюцца ў яго здольнасцях і спадзяюцца, што ён паспее сабраць свой пазл яшчэ да Каляд. «Я спадзяюся, ён збярэ кавалачкі разам і пачастуе нас на Каляды выпіўкай», — марыць прыяцель Хіла.

## Аўстралійскіх палітыкаў прымусяць дыхаць «у трубачку»

**Заканадаўцаў Новага Паўднёвага Уэльса, самага населенага штата Аўстраліі, могуць прымусіць праходзіць «тэст на цвярозасць» проста перад пачаткам галасавання, паведамляе агенцтва Reuters.**

Адпаведная прапанова была вылучана пасля шэрагу інцыдэнтаў, у якіх удзельнічалі п'яныя аўстралійскія палітыкі. Так, 3 снежня член Нацыянальнай партыі Аўстраліі Эндру Фрэйзер быў вымушаны пакінуць ценявы кабінет пасля таго, як рэзка пхнуў свайго калегу. Гэта адбылося позна ўвечары на вясёлай перадкаляднай вечарынцы.

Раней міністр паліцыі Мэт Браўн сышоў у адстаўку пасля таго, як зноў жа на вечарынцы, прысвечанай прыняццю бюджэту, ён стаў танцаваць у адной ніжняй бялізне, дэманструючы на публіцы непрыстойныя рухі.

Члены парламента ад Кансерватыўнай партыі і Партыі зялёных ужо падтрымалі ініцыятыву. Паводле меркавання аднаго з палітыкаў, раз ужо тэст на алкаголь бяруць у вадзіцеляў пад'ёмных кранаў, то яго тым больш трэба браць у тых, хто распрацоўвае і прымае законы.

Минский городской центр недвижимости

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ 29.12.2008 г.

**Фонд «Минскгоримущество» (Продавец) совместно с УП «Минский городской центр недвижимости» (Организатор аукциона) проводят открытый аукцион по продаже объектов коммунальной собственности г. Минска**

| | Лот № | 1 |
|---|---|---|
| 1 | **Наименование и местонахождение объекта, тип и характеристика помещения** | Не завершенный строительством объект — «Магазин промышленных товаров в жилом доме № 2 по генплану со встроенными помещениями. Жилой район Дружба. Микрорайон Дружба-3 (1- я очередь строительства)» |
| 2 | **Общая площадь* (м.кв.)** | 1203,60 |
| 3 | **Начальная цена продажи (руб.)** | 1 700 000 000 |
| 4 | **Сумма задатка (руб.)** | 170 000 000 |
| 5 | **Сроки оплаты объекта** | Оплата за объект производится в течение 30 календарных дней с момента подписания договора купли-продажи |
| 6 | **Характеристика строения** | Фундаменты – сборные железобетонные; стены наружные – из блоков керамических крупноразмерных поризованных; стены внутренние – из кирпича КРПУ – 150/15/СТБ 1160-99; перегородки – из кирпича полнотелого КРПУ; перекрытие – плиты шифр 0-312; полы – бетонные, линолеум, керамическая неглазурованная плитка. Степень готовности объекта по состоянию на 01.05.2008 г. – 63 % |
| 7 | **Условия продажи объекта** | Сохранить функциональное назначение объекта.<br>Возместить сверх цены продажи затраты в течение 30 календарных дней с момента подписания акта приема-передачи объекта стоимости дополнительных проектно-изыскательских, строительно-монтажных и прочих затрат, понесенных заказчиком (УП «УКС Мингорисполкома») по строительству объекта после даты оценки до даты подписания акта приема-передачи.<br>Возместить сверх цены продажи затраты в течение 30 календарных дней с момента подписания акта приема-передачи объекта стоимости дополнительных проектно-изыскательских, строительно-монтажных и прочих работ по инженерным сетям, благоустройству и озеленению по состоянию на 01.05.2008 в сумме 214 703 270 руб. – по лоту № 1, проиндексированных на дату их перечисления по индексам изменения стоимости строительно-монтажных работ по элементам затрат по г. Минску по ресурсно-сметным нормам (для работ, не освобождаемых от налога на добавленную стоимость).<br>Компенсировать УП «УКС Мингорисполкома» затраты по выплате земельного налога с момента принятия объекта по акту приема-передачи до оформления правоустанавливающих документов на земельный участок. |

* *Сведения о площадях объектов, не завершенных строительством, даются на основании проектно-сметной документации.*

1). Аукцион состоится **29 декабря 2008 года** в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

2). Для участия в аукционе необходимо представить в адрес УП «Минский городской центр недвижимости» следующие документы: заявление на участие в аукционе по установленной форме;

юридическим лицам – резидентам Республики Беларусь – нотариально заверенные копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации, представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность;

представителям физических лиц – резидентов Республики Беларусь – нотариально заверенную доверенность;

юридическим лицам – нерезидентам Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с заверенным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык;

- документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим его банком или иным финансово-кредитным учреждением, с заверенным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык;

- представители юридических и физических лиц – нерезидентов Республики Беларусь – легализованную в установленном порядке доверенность с заверенным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык.

При подаче документов на участие в аукционе представитель юридического лица должен представить паспорт или иной документ, удостоверяющий личность, а также документы, подтверждающие его полномочия на участие в аукционе и на подписание документов:

- руководитель юридического лица – документ о его назначении или избрании, а при необходимости – документ о его полномочиях, согласно уставу юридического лица;

- иные представители – доверенность, оформленную согласно учредительным документам юридического лица.

Физическое лицо (или его представитель, участвующий в аукционе по доверенности, удостоверенной нотариально) должно представить паспорт или иной документ, удостоверяющий личность;

соглашение о правах и обязанностях сторон;

заверенные банком копии платежных поручений, подтверждающих внесение:

а) задатка в сумме 10 % начальной цены;

б) платы за участие в аукционе в размере 4-х базовых величин. Денежные средства перечисляются на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк», по Минской области, код 153001331, УНП 190398583.

Победителем торгов по каждому лоту признается участник, предложивший наиболее высокую цену. Договор купли-продажи между Продавцом и Покупателем заключается в течение 10-ти рабочих дней с даты проведения аукциона. Оформление акта землепользования производится Покупателем.

Победитель аукциона обязан произвести оплату организатору аукциона за подготовку и проведение аукциона в размере 4 процентов от начальной цены продаваемого объекта и 5 процентов от суммы превышения цены продажи над начальной.

Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются по 24 декабря 2008 г. до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефон для справок: 227 40 22. Интернет: www.mgcn.by**

УНП 190398583

Ведай нашых!

# «Нёман»: цёплае супершкло

**Выстава «Свет шкла» адкрылася ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі да 125-годдзя шклозавода «Нёман». На ёй прадстаўлена больш за 300 шкловырабаў XX — пачатку XXI стагоддзя, зробленых мастакамі шклозавода. Выстава размясцілася ў 5 выставачных залах Нацыянальнага мастацкага музея, аднак гэта — усяго толькі адна дзясятая частка ўсіх вырабаў, якія захоўваюцца ва ўласным музеі прадпрыемства «Нёман».**

Нацыянальны мастацкі музей таксама мае вялікую калекцыю шкла — каля 800 адзінак, але зараз іх стане на 264 прадметы болей — столькі мастацкіх шкляных вырабаў не паедуць назад у Бярозаўку, а застануцца ў музеі назаўсёды ў якасці падарунка ад шклозавода «Нёман».

На адкрыцці выставы была магчымасць пагутарыць з мастакамі і майстрамі шклозавода, і «Звязда» пацікавілася ў мастака, а адначасова і намесніка дырэктара па дызайне прадукцыі Васіля Самахвалава пра адносіны кіраўніцтва прадпрыемства і падначаленых мастакоў:

— Пытанне складанае, бо мастак і адміністрацыя — гэта заўсёды антаганізм. Мастак хоча вольна жыць, прыходзіць на працу калі хоча, але паколькі мы працуем на буйным прамысловым прадпрыемстве, то, безумоўна, такія рэчы ў нас не праходзяць: мы прыходзім на працу а восьмай раніцы, а сыходзім як Бог на душу пакладзе. Тое, што вы тут бачыце на выставе, гэта ў большай ступені творчыя працы мастакоў, якія яны робяць па ўласнай ініцыятыве. А па сутнасці, задача мастака на такім вялікім прадпрыемстве (5 мастакоў на 3800 чалавек) — усіх забяспечыць працай, прыдумаць рэчы, якія будуць ісці мільённымі тыражамі, таму большую частку часу мастак стварае вырабы масавай вытворчасці. Вось зараз, напрыклад, пайшла турэцкая і іншая прадукцыя механізаванай вытворчасці, але яна дубаватая, грубая. Нашы ж мастакі вылізваюць рэчы нават масавай вытворчасці, каб той самы келіх было прыемна ў рукі ўзяць, каб гэта інтэлігентна было, каб сілуэт прыгожы быў і гэтак далей. Колькі гадоў таму, яшчэ ў савецкія часы, у нас асноўным асартыментам былі чарка, фужэр, келіх. І людзі куплялі, у сервант ставілі, па святах даставалі, выпівалі, выціралі і асцярожна назад ставілі. Толькі тры вырабы: чарка для гарэлкі, фужэр для шампанскага і келіх для віна. Цяпер жа людзі глядзяць серыялы, гартаюць глянцавыя часопісы, каталогі — і сталі бачыць, што і як п'юць ва ўсім свеце. І таму ў нас цяпер лінейка для піцця пашырана да 15 відаў: для кожнага віна свой келіх, для шампанскага тры віды фужэраў, для каньяку, лікёраў, брэндзі, шэры, вады, піва — свае ёмістасці. І трэба ж яшчэ, каб і адзіны вобраз прачытваўся, хоць кожны напой патрабуе сваю форму. І зрабіць гэта прыгожа і функцыянальна — вельмі цяжкая праца для мастака. Аўтарскія ж вырабы мастак таксама стварае і пакідае на заводзе. Калі ён захоча — то можа выкупіць не больш за 5 сваіх вырабаў за год па сабекошце. Сабекошт — гэта па цане шклабою, або вельмі танна. І ўжо потым мастак сам можа выкупленыя вырабы прадаць ці то ў музей, ці то ў галерэю.





Падзівіцца на шкляныя цуды беларускіх майстроў можна будзе да 10 студзеня 2009 года, ну а пасля, як сказаў на адкрыцці Ігар Бацян, дырэктар шклозавода: «Хто захоча больш падрабязна пазнаёміцца, прыязджайце да нас на шклозавод «Нёман».

**Павел БЕРАСНЕЎ.**

## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 8.12 | 15.49 | 7.37 |
| Віцебск — | 8.09 | 15.32 | 7.23 |
| Магілёў — | 8.02 | 15.39 | 7.37 |
| Гомель — | 7.51 | 15.44 | 7.53 |
| Гродна — | 8.26 | 16.05 | 7.39 |
| Брэст — | 8.18 | 16.14 | 7.56 |

**Месяц**

*Першая квадра. Месяц у сузор'і Рыбаў.*

**Імяніны**

***Пр.*** *Аляксандра, Аляксея, Барыса, Макара, Мітрафана, Рыгора, Фёдара.*

***К.*** *Леанціны, Емяльяна, Здзіслава, Зянона, Мікалая.*



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.




## Дзве даты

### 6 снежня



**1795 год** — пазбаўлены ўлады кароль Рэчы Паспалітай Станіслаў Аўгуст Панятоўскі пад рускім канвоем прыбыў у Гродна. Такі сумны вынік рэформаў манарха, які спрабаваў прывіць славянскай краіне сістэму «чыстага парламентарызму».

**1877 год** — у Нью-Джэрсі амерыканскі вучоны і вынаходнік Томас Эдысан прадэманстраваў работу першага фанографа, прачытаўшы, а пасля ўзнавіўшы запіс верша «У Мэры была маленькая авечка».

## Цытата дня

***«Як бы дрэнна мужчыны ні думалі пра жанчын, любая жанчына думае пра іх яшчэ горш».***

**Нікаля Шамфор (1741—1794), французскі пісьменнік.**

# «МІРСКАЯ»




**7 снежня ў некаторых рэгіёнах наладжвалі «Свята свечкі» — абшчыннае свята дарослых жыхароў вёскі, на якім пераносілі з хаты ў хату «мірскую» свячу, якая прыналежыла абшчыне або некалькім вёскам, і наладжвалі сумесную трапезу-братчыну. У некаторых месцах такое свята таксама звалі братчынай.**

Раніцай свячу ставілі ў чырвоным куце, запальвалі, чыталі малітвы, затым ладзілі ў гэтай жа хаце трапезу, прычым кожны з аднавяскоўцаў павінен быў прыйсці са сваім пачастункам. Звычайна да «аброчнай» ці «мірской» свечкі неслі падарункі: грошы, якія потым ахвяравалі храму, прадукты, частаванні.

● Па меркаваннях шматлікіх даследчыкаў «свята свечкі» гэта ні што іншае, як водгук старажытных славянскіх святаў, прысвечаных язычніцкім боствам, якім ахвяравалі воск, мёд і піва, каб атрымаць у абмен дабрабыт абшчыны. Аб гэтым сведчаць пісьменныя крыніцы XII—XVII стст.

● У некаторых рэгіёнах «свята свечкі» распачыналі ўвечары. З хаты былога гаспадара свечку неслі ў храм, дзе пакідалі на ўсю ноч. Раніцай каля яе служылі ранішняе набажэнства, а затым «мірам» пры вялікай колькасці прыхаджан свечку неслі ў хату, якую вызначыла братчына — вышэйшы орган улады ў вёсцы. Затым пры ўсіх свечку запальвалі і служылі набажэнства.

● Пасля гэтага ў хаце ладзілі вясёлы стол. Стравы прыносілі аднавяскоўцы, акрамя таго, гаспадары хаты да гэтага дня імкнуліся падрыхтаваць як мага болей прысмакаў, папярэдне кармілі парсючка ці бычка, каб пачаставаць на братчыне сваіх аднавяскоўцаў.

● Сярод аднавяскоўцаў хата, у якую ў наступным годзе прынясуць «мірскую свячу», павінна карыстацца асаблівай павагай. А тыя, да каго неслі свечку, павінны былі ўсвядоміць, які гонар ім выказвае абшчына.

● Чарговасць пераносу свечкі магла мяняцца, калі ў якой-небудзь сям'і надаралася няшчасце. У такім выпадку свечку неслі туды. Лічылася, што яе прысутнасць адвядзе бяду ад гэтай хаты, прынясе поспех, палепшыць дабрабыт, верне лад і спакой.

● У хату, якая «ўславілася» дрэннымі ўчынкамі, «мірскую свячу» ніколі не прыносілі. Так абшчына выказвала негатыўныя адносіны да гэтай сям'і.

● Трэба адзначыць, што «свята свечкі» ў розных рэгіёнах мела свае асаблівасці, дні святкавання. Напрыклад, у Гомельскай вобласці ў вёсцы Стаўбун гэта свята ладзяць штогод на Ушэсце.

● Сярод сялян мінулага стагоддзя існавала меркаванне, што адмова святкаваць «свечку» магла наклікаць на вёску эпідэмію, мор жывёлы, няўрод і г.д.

● Часам да «свята свечкі» прымяркоўвалі кірмашы і гандлі з продажам палотнаў жывёлы і іншай сельскагаспадарчай прадукцыі.

**Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.**

## Усміхнёмся!

Раніца пасля вяселля. Муж застае маладую жонку на кухні ў слязах.

— Што здарылася, дарагая?

— Я ўжо дзве гадзіны вару гэтае яйка, а яно ўсё яшчэ цвёрдае!

☺

**Званок у дзверы. Жонка адчыняе, а на парозе — муж у вусцілку п'яны. Жонка пытае:**

**— Зарплату прынёс?**

**Муж падае, а на спіне крэйдай напісана: НЕ!**

☺

— Сынок! Ты не рукі памыў, ты мыла выпэцкаў!

☺

**Адмысловая прапанова для кліентаў GSM — «Ненавісны нумар». Цяпер усе званкі вашых ворагаў вам тарыфікуюцца для іх як міжнародныя.**

☺

Кажуць, Хасэ Карэрас захварэў маніяй велічы. Ён выбягаў на сцэну «Ла Скала» і крычаў:

— Я Коля Баскаў!

☺

**Флоцкая аксіёма: калі прадмет рухаецца — аддай яму чэсць, калі не рухаецца — пафарбуй яго!**






### Усходні гараскоп на наступны тыдзень

# Блізняты могуць пачынаць новую справу, а Дзевам неабходна прывесці ў парадак дакументы

**АВЕН.** Цалкам верагодна, што вам давядзецца з галавой улезці не ў сваю справу, паколькі вы таксама зацікаўленыя ў яе паспяховым завяршэнні. Падрыхтуйцеся да таго, што давядзецца абараняць свае правы і тлумачыць, што вы наогул тут робіце.

**ЦЯЛЕЦ.** Верагодныя некаторыя цяжкасці ў справах. Будзе неабходна даказваць прафесійную кампетэнтнасць як у сур'ёзных пытаннях, так і ў дробязях. Калі гэта атрымаецца, то ваш аўтарытэт значна ўзрасце, што будзе спрыяць пасоўванню па кар'ернай лесвіцы. Пажадана прымаць усе рашэнні самастойна, не прыслухваючыся да ўяўных добразычліўцаў і аматараў даваць «мудрыя» парады.

**БЛІЗНЯТЫ.** Тыдзень складаны і напружаны ў шматлікіх адносінах. Варта прыкласці намаганні — і яны не прападуць дарма. У аўторак надыходзіць спрыяльны момант для пачатку новай справы, набыцця новых кантактаў і сувязяў. Магчымая дапамога ад уплывовых заступнікаў, але, перш чым яе прыняць, варта добра падумаць.

**РАК.** Дзейнічайце, не зацыклівайцеся на доўгіх разважаннях — інстынкты і інтуіцыя вас не падвядуць. Праблемы на працы хутчэй за ўсё, вырашацца на вашу карысць. У любым выпадку сябры і заступнікі вам дапамогуць. Звярніце пільную ўвагу на праблемы дзяцей і блізкіх — ім будзе патрэбна ваша спагада.

**ЛЕЎ.** Магчыма расчараванне ў кімсьці з блізкіх людзей, але гэта не падстава для засмучэння. Раптоўны званок — і вы ўжо ззяеце ад шчасця. Чацвер і пятніца — амаль ідэальныя дні для таго, каб заняцца падрыхтоўкай і рэалізацыяй сур'ёзных планаў. Асабліва цікавыя ідэі могуць наведаць у пятніцу: паспрабуйце запісаць іх, каб не выпусціць з-пад увагі такія неабходныя, але, з першага погляду, малаважныя дэталі.

**ДЗЕВА.** На гэтым тыдні асаблівую значнасць набудуць кантакты, сувязі і паездкі. Прывядзіце ў парадак усе дакументы — зараз гэта атрымаецца лёгка і паспяхова. Можна разлічваць на разумную падтрымку і дапамогу калегаў. Праяўляйце настойлівасць пры адстойванні сваіх інтарэсаў — і поспех вам забяспечаны.

**ШАЛІ.** Пажадана не спадзявацца, што выпадкова пашанцуе, — старанна плануйце ўсе свае справы. Надыходзіць час высокай творчай актыўнасці. У сераду паклічце на дапамогу актыўнасць і інтуіцыю. У чацвер магчыма рэалізацыя арыгінальных праектаў. Толькі не праспешвайце падзеі. Не хвалюйцеся: хатняя бязладзіца хутка скончыцца, і запануе мір і спакой.

**СКАРПІЁН.** З'явіцца магчымасць вызначыцца сваёй вынаходлівасцю. Вы таксама можаце паказаць прыклад працаздольнасці. Начальства справядліва ацэніць вашы заслугі. Будзе спадарожнічаць поспех у камерцыйных аперацыях, звязаных з нерухомасцю, будаўніцтвам або ўладкаваннем жылля. Дзеці пацешаць сваімі дасягненнямі.

**СТРАЛЕЦ.** Пажадана захоўваць спакой і разважлівасць. Гаварыце менш і лепш захоўваеце свае сакрэты. Тады многія жаданні ажыццявяцца. У панядзелак самы час здзейсніць чарговы рывок па кар'ернай лесвіцы, а вось якім чынам гэта зрабіць — падкажа інтуіцыя.

**КАЗЯРОГ.** Наяўнасць пачуцця меры ва ўсім і добра развітая інтуіцыя дазволяць своечасова абыйсці падводныя камяні. У справах шукайце для сябе карысць і набірайцеся неабходнага вопыту. Рашуча адстойвайце сваю жыццёвую пазіцыю, але не бойцеся змяніць погляды, калі разумееце, што памыляецеся. Давядзецца разлічваць толькі на свае сілы, бо сябры пры ўсім жаданні нічым не змогуць дапамагчы.

**ВАДАЛЕЙ.** Проста неабходна стаць нарэшце больш канструктыўнымі і сабранымі. Галоўнае — выбраць правільную стратэгію і спакойна рэагаваць на падзеі, якія адбываюцца. Поспех абавязкова ўсміхнецца вам, калі вы будзеце выконваць усё, што абяцалі. Сур'ёзна пастаўцеся да прапаноў сваякоў. Дапамога сяброў і нават проста знаёмых будзе і неабходнай, і своечасовай.

**РЫБЫ.** Выкарыстайце гэты тыдзень для атрымання інфармацыі і ведаў. Звяртайце пільную ўвагу на тое, што адбываецца вакол вас. Пабольш упэўненасці ва ўласных сілах! Вельмі важна, каб вы захоўвалі эмацыйную раўнавагу, але пры гэтым больш давяралі сваёй інтуіцыі. Паспрабуйце праявіць цярпенне і не спяшайцеся, каб не прапусціць важных падзей.

## ДНІ ПАМЯЦІ КАНСТАНЦІНА СІМАНАВА Ў МАГІЛЁВЕ

Сёння, 6 снежня, старшыня Магілёўскага гарвыканкама Віктар Шорыкаў прыме расійскую дэлегацыю ў Ратушы. Чакаецца, што ў Магілёў прыедзе сын пісьменніка Аляксей Сіманаў. Дарэчы, у зале прыёмаў Ратушы сярод партрэтаў слынных дзеячаў Магілёўшчыны ёсць выява і Канстанціна Сіманава.

Мерапрыемствы прысвечаны 93-й гадавіне з дня нараджэння пісьменніка і арганізаваны грамадскай арганізацыяй «Рускае таварыства» пры падтрымцы Пасольства Расійскай Федэрацыі ў Беларусі.

У праграме дзён памяці — экскурсія на Буйніцкае поле, якое Канстанцін Сіманаў праславіў сваім рэпартажам у 1941-м годзе і кнігай «Жывыя і мёртвыя» пра абаронцаў Магілёва. У 1979 годзе прах пісьменніка быў развеяны над гэтым полем, і там цяпер стаіць вялізны камень з факсіміле К.С. Урачыстая вечарына памяці адбудзецца ў суботу ў Беларуска-Расійскім універсітэце.

**Ілона ІВАНОВА.**

## ХТО МАЦНЕЙШЫ З «БАБРОЎ»?

6-7 снежня пад Барысавам на танкадроме «Французская горка» адбудзецца пяты і заключны этап «Баброў — джып-трыялу» сезона 2008 года. Чакаецца гарачая барацьба за перамогу, таму што лідараў размяжоўваюць лічаныя ачкі.

Паводле інфармацыі арганізатараў, у барацьбу за Кубак Нацыянальнага Алімпійскага камітэта Рэспублікі Беларусь пойдуць 40 экіпажаў. Вялікую колькасць удзельнікаў можна растлумачыць галоўнай асаблівасцю джып-трыялу: прыняць удзел тут можа любы жадаючы на сваім аўтамабілі ці квадрацыкле ў асобным ад прафесіяналаў заліку. Гэты сезон стартаваў у Магілёве, другі этап прымаў Гомель, трэці прайшоў у Брэсце, чацвёрты — у Бабруйску. На чарзе — барысаўскі танкадром.

**Юрась ШАЎЦОЎ.**

# ШАХМАТЫ

*Пад рэдакцыяй майстра спорту Уладзіміра СЫЧОВА*

**ТВОРЧАСЦЬ ЧЫТАЧОЎ**

**В. Жук і В. Тупік**

(Брэсцкая вобласць)



Белыя выйграюць. (5+4).

**В. Жук і В. Тупік**

(Брэсцкая вобласць)



Нічыя. (5+4).

Чакаем вашых адказаў.

**ПАЯДЫНКІ БЕЛАРУСКІХ МАЙСТРОЎ**

Разгледзьце наступную партыю, у якой малапрыкметны промах у пачатковай стадыі гульні прывёў да дрэннага выніку.

**У. Літвінаў — С. Бягун**

*Скандынаўская абарона*

1. e4 d5 2. ed Kf6 3. d4 K:d5 4. c4 Kb6 5. Kc3?! e5! 6. d5? c6! 7. Фf3 Cb4 8. a3 C:c3 9. Ф:c3 0-0 10. dc K:c6 11. Ce3 Kd4! 12. 0-0-0 Ka4 13. Фe1 Cf5 14. C:d4 ed 15. Фb4 b5! 16. Kf3 Фf6 17. Л:d4 Лfd8 18. Фd2 Kc5 19. Л:d8 Л:d8 20. Фe3 Фh6 21. b4 Фf6 22. Ke5 Kd7 23. f4 Cg6 24. c5 K:e5 25. Ф:e5 Фa6! Цяпер слова за тэхнікай рэалізацыі перавагі. 26. Фc3 Фe6 27. Kpb2 Фe4 28. a4 Фb1+ 29. Kpa3 a5 30. ba b4+ 31. Ф:b4 Фa1+ 32. Kpb3 Cf5 33. Фb6 Лe8 34. c6 Ce6+ 35. Kpb4 g6 36. Лg1 Лc8 37. Ca6 Фb2+ 38. Kpc5 Фc3+ 39. Kpd6 Фa3+ 40. Kpe5 Лe8 41. Kpd4 Cf5 42. Лf1 Фe3+ 43. Kpd5 Ce6+ 44. Kpd6 Фd2+ 45. Kpe5 Ca2+ і чорныя выйгралі.

А ўжо ў наступным паядынку белыя паспяхова правялі атаку на чорнага караля.

**У. Літвінаў — С. Бягун**

*Сіцыліянская абарона*

1. e4 c5 2. Kf3 a6 3. Kc3 e6 4. d4 cd 5. K:d4 Фc7 6. Ce2 Kc6 7. 0-0 Kf6 8. Kb3 d6 9. f4 Ce7 10. Ce3 0-0 11. g4 d5 12. e5 Kd7 13. g5 Лd8 14. Cf3 Kf8 15. Ke2 Cd7 16. Фe1 Kb4 17. Фf2 Лdc8 18. Kbd4 Cb5 19. a3 C:e2 20. C:e2 Kc6 21. Kb3 Kd7 22. Лad1 b5 23. Cd3 g6 24. c3 Ka5 25. K:a5 Ф:a5 26. f5 ef 27. C:f5 gf 28. Ф:f5 C:c5 29. Ф:f7+ Kph8 30. Лd4 Лg8 31. Ф:d7 Фd8 32. Фg4 C:d4 33. Ф:d4 Лg6 34. e6+ Kpg8 35. Фe5 Фe7 36. Лf6 Лe8 37. Фf5 Фg7 38. Лf7 і чорныя здаліся.

Партыі былі згуляныя на мемарыялах А. Сакольскага.

**ЗАПРАШАЕМ ДА ЎДЗЕЛУ!**

Аб'яўлены мемарыяльны конкурс «Уладзіміру Брону — 100».

**Дзвюхходоўкі (#2)**. Адрас прысылкі: Россия, 624804, Свердловская область, Сухой Лог-4, а/я 41, В. Пильченко.

**Трохходоўкі (#3)** і **шматходоўкі (#n).** Адрас прысылкі: Россия, 620109, Екатеринбург, ул. Крауля, д. 55, кв. 87, В. Шаврину.

**Эцюды.** Адрас прысылкі: Россия, 620143, Екатеринбург, а/я 331, С. Осинцеву.

**Задачы на кааператыўны мат (H#n).** Адрас прысылкі: Россия, 624992, Свердловская область, г. Серов, ул. Ленина, 142, кв. 34, В. Кириллову.

**Задачы на зваротны мат (S#n).** Адрас прысылкі: Россия, 624140, Свердловская область, г. Кировград, ул. Декабристов, 17, кв. 1, Н. Плетенёву.

Ва ўсіх раздзелах устаноўлены прызы, ганаровыя і пахвальныя водгукі. Тэрмін прысылкі для ўсіх раздзелаў — 1 мая 2009 г.

# ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

ДЛЯ ВАШАЙ КАРЫСЦІ

## Эліксір здароўя

**У даўніну заўсёды квасілі многа капусты, елі яе ўсю зіму і пілі капусны расол. На жаль, пра лекавыя ўласцівасці расолу сёння часцей узгадваюць толькі ў сувязі з пахмельным сіндромам. І дарэмна! Гэты вельмі каштоўны напітак дапаможа зімой аднавіць недахоп вітамінаў, дасць зарад бадзёрасці і вылечыць ад многіх хваробаў.**

**НАТУРАЛЬНЫ АНТЫБІЁТЫК**

Чым жа карысны сок квашанай капусты? Спецыялісты лічаць, што ў ім змяшчаецца яшчэ больш вітамінаў (С, В2, РР) і біялагічна актыўных злучэнняў, чым у самой капусце, таму што многія з іх пераходзяць менавіта ў салявы раствор. Акрамя таго, пры квашанні ўтвараюцца новыя злучэнні, і адно з самых каштоўных — малочная кіслата.

Малочныя бактэрыі, трапляючы ў кішэчнік, паляпшаюць яго дзейнасць, насяляюць карыснай мікрафлорай, падаўляюць шкодныя бактэрыі. Таму расол — выдатны сродак ад бактэрыёзу. А яшчэ капусны расол — добры сродак прафілактыкі атэрасклерозу, ён дапамагае справіцца з таксікозам у цяжарных, нармалізуе ўзровень цукру пры дыябеце.

Праведзеныя даследаванні паказалі, што той, хто выпівае хоць бы 2 шклянкі капуснага расолу на тыдзень, паніжае рызыку захворвання на рак кішэчніка.

**НАПІТАК ВІТАМІННЫ І ПАДБАДЗЁРЛІВЫ**

З капуснага соку можна прыгатаваць цудоўныя напіткі. *Вазьміце па 1 шк. расолу і таматнага соку, 1 ст. лыжку лімоннага соку, па 0,5 шк. цукру і халоднай гатаванай вады, крыху солі. Усё добра перамяшайце. Шклянка такога кактэйлю ў дзень забяспечыць арганізм неабходнымі вітамінамі, асабліва аскарбінавай кіслатой.*

Як было сказана вышэй, капусны расол добра вядомы ў народзе як лепшы сродак ад пахмелля. Для гэтага на яго аснове робяць розныя сумесі з хрэнам, часнаком, перцам. Напярэдадні шмат святочных дзён, магчыма, некаму спатрэбіцца такі рэцэпт.

*Вазьміце 3 шк. расолу, дадайце 1 шк. здробненай цыбулі, 1 ст. лыжку таматнага соусу, перац, цукар, соль — на смак. Усё перамяшайце. У першы прыём выпіце 0,5 шк., затым на працягу дня дапіце астатняе. Такі напітак зніме галаўны боль, ваніты і іншыя сімптомы алкагольнага атручэння.*

**НАРОДНЫЯ РЭЦЭПТЫ**

● Пры жоўцекамянёвай хваробе і парушэннях у рабоце падстраўнікавай залозы цёплы капусны сок піце тры разы на дзень па 0,5 шк. за 30 хвілін да яды. Гэты ж курс лячэння праводзяць пры гастрыце з паніжанай кіслотнасцю (2—3 тыдні), лямбліях у печані, цукровым дыябеце для паніжэння цукру ў крыві (пад кантролем урача).



● Хворым на гепатыт карысна прымаць цёплы расол па 1 шк. адзін-два разы на дзень за 20 хвілін да яды.

● Тым, хто пакутуе ад гемарою, які суправаджаецца запорамі і крывацёкамі, рэкамендуецца прымаць унутр па 1 шк. расолу два разы на дзень за 30 хвілін да яды, паступова павялічваючы дозу да 3 шк.

● Пры парадантозе вельмі карысна паласкаць рот капусным расолам і проста жаваць квашаную капусту. Праз тыдзень хвароба адступіць.

-2542-

УТУЛЬНЫ ДОМ

## Змена «дэкарацый»

**На календары снежань, аднак зіма недзе заблукала. А калі на вуліцы цёмна, сыра і хлюпатна, хочацца асаблівай утульнасці. Простыя дызайнерскія прыёмы дапамогуць дадаць крыху цяпла і святла вашаму дому, створаць зімовы настрой.**



1. Водбліскі «жывога» агню — гэта заўсёды атмасфера цяпла і ўтульнасці. Але дзе яго ўзяць гараджаніну? Ідэальны варыянт — камін. Сёння сучасныя каміны выраблююць у розных стылях — ад класікі да авангарду. Гэта можа быць сапраўдны адкрыты камін ці штучны — электрычны. Якім бы ні быў камін, ён надае дому асаблівае зачараванне, бо так прыемна пасядзець ля агню, захутаўшыся ў цёплы плед. Калі ж каміна няма, то «жывы» агонь падорыць... свечкі. Самымі прыдатнымі будуць тыя, што маюць пах духмяных прыпраў.

2. У стварэнні ўтульнасці важную ролю адыгрывае і тэкстыль: шарсцяныя пледы (клетка цяпер асабліва актуальная), футравыя накідкі. Тканыя чахлы, шчыльныя шторы, канапавыя падушкі ў стрыманай колеравай гаме імгненна зменяць стары інтэр'ер.

3. Рукадзельніцы могуць звязаць зімовую «абноўку» для ваз, кашпо, звычайнага чайніка. Вельмі прыгожа глядзяцца белыя чахлы, выкананыя ажурнай вязкай кручком ці пруткамі.

4. Упрыгажэнне для дома, якое можа зрабіць кожны, — букет з засушаных раслін. Важна толькі падабраць расліны рознай вышыні і фактуры, аднак пры гэтым яны павінны гарманічна дапаўняць адна адну. У традыцыйнай зімовай кампазіцыі акрамя кветак выкарыстоўваюцца і розныя прыправы з саграваючым пахам: кара карыцы, гваздзіка, імбір, зярняты какавы, цэдра апельсіна.

5. Не варта забывацца і на жывыя пакаёвыя кветкі, якія таксама ўпрыгожаць зімовы інтэр'ер. Самыя вядомыя з іх — амяла, дзекабрыст, самшыты.

6. Цёплая футравая шкура на падлозе перад ложкам будзе радаваць вас халодным ранкам. Як прыемна, прачнуўшыся, ступіць на мяккае цёплае футра босымі нагамі! Цяпер вялікі выбар штучных і натуральных шкур розных формаў і расфарбовак, здольных упрыгожыць любы дом.

І апошняе. Зусім хутка Новы год, таму ў зімовы інтэр'ер абавязкова дадайце і навагодні дэкор. А дапамогуць вам галінкі елкі ці сасны, бліскучая мішура, рознакаляровыя агеньчыкі, ёлачныя цацкі.

ПАДКАЗКІ БЫВАЛЫХ

## Як выбраць будаўнічыя матэрыялы

Пры набыцці **цэменту** вазьміце жменю яго ў руку і сцісніце. Калі на далоні застануцца дробныя камячкі велічынёй з гарошыну і больш, то гэта значыць, што пачаўся працэс камкавання і канструкцыі, выраблены на аснове такога цэменту, будуць менш трывалымі.

Выбіраючы ж **цэглу**, звярніце ўвагу на яе колер. Нармальнай лічыцца цэгла чырвонага колеру, пры ўдары яна выдае чысты гук і на зломе мае аднародную будову, без пустот і вапны. Цёмна-бурая афарбоўка сведчыць аб тым, што цэгла перапаленая. Такая цэгла вельмі цвёрдая, амаль не ўсмоктвае вільгаць, у яе шклопадобная паверхня з глыбокімі трэшчынамі. Перапаленая цэгла прыдатная для муравання фундамента, яна добра процістаіць сырасці і марозу.

Бледна-ружовая ці карычневая афарбоўка гаворыць аб тым, што цэглу недапалілі. Недапаленая цэгла нетрывалая, пэцкае рукі, моцна ўсмоктвае ваду. Выкарыстоўваць яе можна толькі там, дзе яна не будзе трапляць пад уздзеянне атмасферных ападкаў.

-2543-

Бяседныя песні

# НАВАГОДНЯЯ СВЕЧКА

Навагодняя ноч — сямейнае свята, свята сяброў, свята закаханых. У той момант, калі пачынаецца новы адлік часу, адчуваеш духоўна ўтульней, калі побач блізкія людзі. З імі тут, на застоллі, падсумоўваецца пройдзенае, дасягнутае. Яны шчыра выкажуцца наконт перспектыўнай супольнасці. Выказванне «З кім сустрэнеш новы год, з тым і правядзеш яго» замест дапаўняе ўсталяванае меркаванне «Як сустрэнеш новы год, так яго і правядзеш».

Сустрэча новага года — духоўная таемнасць. У гэты час нашы справы яднаюцца з марамі, а мы самі з грамадою, прыродай, вечнасцю. Менавіта ў такія хвіліны ўдакладняецца агульнасць поглядаў, канкрэтызуецца сумесная дзейнасць. Надзённае, што хвалюе ўсіх прысутных, не засланяецца навагоднімі жартамі, гульнямі, не хаваецца за святочным настроем, за перажываннямі ў чаканні загадкавай будучыні. Праблемы, учарашнія і сённяшнія, кладуцца ў аснову гутаркі. Аднак яе змест не разгортваецца адцягнута (не ілюструе дасведчанасць прамоўцы), а закранае аспекты ўдзелу таго ці іншага з бяседнікаў у развіцці агульных спраў. Заўсёды ў новым годзе мы чакаем абнаўлення, жаданых зменаў. І адначасова не хочам страціць ужо набытага, што вабіць нас. Якраз за навагоднім сталом у абмеркаванні духоўна спалучаецца традыцыйнае з навізной. Адчуванне стабільнасці і адчуванне абнаўлення мусяць суладна сумясціцца ў гаспадароў і ў гасцей.

На навагодняй бяседзе пастаянна прапануюцца тосты-пажаданні, тосты-праекты. У гэтую ноч, якая з'яўляецца стартавай пляцоўкай для новых творчых і вытворчых узлётаў, варта ўзняць і тост-прабачэнне. Гэтага вымагае воля духу. Бо на жыццёвым шляху сустракаліся з рознымі нечаканасцямі. І не заўсёды трымаліся годна. Таму ў навагоднюю ноч мусім прасіць прабачэння. Дзеля будучыні. Дзеля яе чысціні...

Навагодняя бяседа, на якой валадарыць любоў, павага, шчырасць, загартоўваецца песняй. І не адной. Усё выказанае, загаданае, пажаданае на ёй збудзецца, абавязкова збудзецца, калі асвеціцца песняй. Сумеснай. Роднай...

Ансамбль «Сябры» і яго саліст народны артыст Беларусі Анатоль Ярмоленка дапамогуць далучыцца да мілагучнага вакальнага твора «Навагодняя свечка». Паэт Леанід Дранько-Майсюк і кампазітар Мікалай Сацура данеслі нам рамантычную чароўнасць навагодняй дзеі, асветленай прыцягальнай пачуццёвасцю.

**Верш Леаніда Дранько-Майсюка**
**Музыка Мікалая Сацуры**

*Дамы стомлены, спяць кавалеры,*
*Высыхаюць азёры віна,*
*А на нашым стале два фужэры,*
*Два фужэры і свечка адна.*

Прыпеў:
*Запалі навагоднюю свечку*
*І шампанскім крышталь абудзі,*
*І нібы, на маленькую вечнасць,*
*На блакітную свечку глядзі.*

*Што нам дамы і што кавалеры!*
*Залатая прайшла даўніна...*
*Ёсць у нашай маленькай кватэры,*
*Ёсць усё — ад агню да віна.*

Прыпеў.

*Ай вы, дамы, і вы, кавалеры!*
*Ах, паэзіі вашай струна —*
*Засталіся ад вас два фужэры,*
*Два фужэры і свечка адна.*

Прыпеў.

**Падрыхтаваў Міхась ШАВЫРКІН.**

Калі вы падпісаліся на газету **«Звязда» на І квартал або 1-е паўгоддзе 2009 года** — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце яе **да 5 студзеня** ў рэдакцыю на адрас: **220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А**.

Падпісчык можа выйграць у якасці прызоў гадзіннікі, майкі, бейсболкі, тэлевізары «Віцязь», печ-СВЧ і халадзільнік. Розыгрыш прызоў праводзіцца **8 студзеня 2009 г.**, вынікі публікуюцца ў газеце «Звязда» **да 18 студзеня 2009 г.**

Атрымаць прыз можна ў рэдакцыі **да 20 сакавіка 2009 г.** пры прад'яўленні квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на І квартал або 1-е паўгоддзе 2009 года і пашпарта. Дастаўку тэлевізараў, печы-СВЧ і халадзільніка ажыццяўляе рэдакцыя. **Пасля 20 сакавіка** выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца.

**Больш падрабязна правілы гульні «Падпішыся на «Звязду» чытайце ў нумары газеты за 4 лістапада 2008 года. Удачы ў гульні!**

Тэрмін правядзення гульні — з 04.11.08 па 14.01.09.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 1223 ад 30.10.08, выдадзена Міністэрствам гандлю РБ.

**6 Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на І квартал або 1-е паўгоддзе 2009 года**

**Прозвішча, імя, імя па бацьку** ______________________________

______________________________

**Падпіска афармлена і аплачана ў** ______________________________
**(аддзяленне сувязі)**

______________________________ **на І кв. або 1-е паўг. 2009 года**

**Хатні адрас і тэлефон** ________ **(індэкс)** ______________________________

______________________________

______________________________

**Удачы ў розыгрышы!**

Ф.СП-1 Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь

**АБАНЕМЕНТ** на газету ЗВЯЗДА з бясплатнымі ўкладкамі: «ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

(індэкс выдання)

Колькасць камплектаў

на 2009 год па месяцах

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | | | | |

Каму ______________________________ (прозвішча, ініцыялы)

Куды ______________________________ (адрас)

(паштовы індэкс) ______________________________ (горад, населены пункт)

**ДАСТАВАЧНАЯ КАРТКА** на газету ЗВЯЗДА з бясплатнымі ўкладкамі:

(індэкс выдання)

ПВ | месца | літар

«ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

| Кошт | падпіскі | ________ руб. | Колькасць камплектаў | |
|---|---|---|---|---|
| | пераадрасоўкі | ________ руб. | | |

на 2009 год па месяцах

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | | | | |

Каму ______________________________ (прозвішча, ініцыялы)

Куды ______________________________ (адрас)

(паштовы індэкс) ______________________________ (горад, населены пункт)

## НАСЕЛЬНІЦТВА Ў СТУДЗЕНІ—ЛІСТАПАДЗЕ КУПІЛА АМАЛЬ 1857 КГ ЗОЛАТА Ў ЗЛІТКАХ

Аб'ём прададзеных насельніцтву Беларусі залатых мерных зліткаў у студзені—лістападзе 2008 года ў параўнанні з аналагічным перыядам 2007 года павялічыўся ў 1,9 раза і склаў больш як 1856,7 кг (64 365 штук), паведамілі БЕЛТА ва ўпраўленні інфармацыі Нацыянальнага банка Беларусі.

Найбольшай папулярнасцю ў насельніцтва карыстаюцца 10-грамовыя залатыя зліткі, якіх за 11 месяцаў прададзена 17 969 штук, або 28 працэнтаў агульнай колькасці. Адзначана таксама цікавасць да 20-грамовых і 5-грамовых мерных зліткаў з золата — іх прададзена 13 120 і 13 287 штук адпаведна. Акрамя таго, у студзені—лістападзе было набыта 160 зліткаў па 1 кг і 595 па 0,5 кг. Банкамі назад выкуплена каля 194 кг золата.

Паводле даных на 2 снежня 2008 года, цана продажу 1-грамовага залатога злітка была ўстаноўлена Нацыянальным банкам у памеры Br80,03 тыс., злітка 1 кг — Br64,84 млн.

Цана продажу 5-грамовага плацінавага злітка на 2 снежня гэтага года склала Br798,15 тыс., злітка 0,5 кг — Br46,1 млн.

Паводле даных на 2 снежня гэтага года, цана продажу 10-грамовага сярэбранага злітка склала Br21,63 тыс., злітка 1 кг — каля Br1,45 млн.



# «БЕЛЭКСІМГАРАНТ»:
## «Мы абараняем айчыннага экспарцёра яшчэ на стадыі падрыхтоўкі кантракта»



**У лютым 1998 года, калі пачыналася гісторыя гэтай унікальнай па выконваемых задачах арганізацыі, у ёй працавала толькі чатыры чалавекі. Сёння заняты 250 высакакласных спецыялістаў. Такога страхавога агенцтва няма пакуль у Расіі і ва Украіне.**

**У рэйтынгу страхавых кампаній Беларусі яно займае першае месца па памеры статутнага капіталу і другое — па памеры ўласнага капіталу. Першым сярод страхавых кампаній Беларусі атрымала ад міжнароднага рэйтынгавага агенцтва “Fitch Ratings” рэйтынг фінансавай устойлівасці “B”, прагноз “Стабільны”. Для страхавой кампаніі дабіцца ўсяго за дзесяць гадоў работы такіх вышынь, тым больш — на непрадказальным знешнім рынку — гэта вынік, які робіць гонар яе кіраўнікам і калектыву.**

**Дарэчы, пра кіраўніка. Якраз у гэтыя дні арганізатару і нязменнаму генеральнаму дырэктару «Белэксімгаранта» Вячаславу Дзмітрыевічу БАЛІБОКУ споўнілася 60. Яго вопыт работы ў Міністэрстве фінансаў, у Кантрольнай палаце Рэспублікі Беларусь, на пасадзе намесніка старшыні праўлення Ашчаднага банка Беларусі, а потым намесніка кіраўніка «Белдзяржстраха» аказаўся як мага лепш запатрабаваным на сённяшняй вельмі клапатлівай пасадзе. Як і яго дзелавыя якасці: высокі прафесіяналізм і выдатныя арганізатарскія здольнасці.**

**Павіншаваўшы паважанага юбіляра з цудоўнай датай, журналісты «Звязды» задалі некалькі пытанняў на вельмі актуальную сёння тэму.**

**— Вячаслаў Дзмітрыевіч, ва ўмовах фінансавага крызісу, які даволі адчувальна заяўляе аб сабе ў сусветнай эканоміцы, страхаванне рызыкі для айчынных прадпрыемстваў-экспарцёраў набывае першараднае значэнне, ці не так?**

— Прадпрыемствам-экспарцёрам у новых умовах і весці сябе патрэбна пановаму: шукаць і новыя, устойлівыя рынкі збыту, і новыя формы работы са спажыўцамі прадукцыі. Таму што ў новых умовах для ўсіх прадпрыемстваў-вытворцаў паўстае галоўнае, бадай, пытанне: як збыць сваю прадукцыю? Калі раней нашы прадпрыемствы, асабліва манапалісты, займаліся збытам у асноўным па папярэдняй аплаце, то сёння многія краіны гэты механізм мяняюць і прапануюць гандляваць у растэрміноўку. Скажам, Банк Украіны нядаўна прыняў пастанову, у якой гаворыцца, што пры імпарце ва Украіну, напрыклад, з Беларусі аплата можа праводзіцца толькі пасля таго, як прадукцыя, тавар наступіць на тэрыторыю Украіны. Гэта значыць, нашым прадпрыемствам, што гандлююць з суседзямі, даводзіцца пераглядваць умовы знешнеэканамічных кантрактаў, і для іх павялічваецца рызыка неаплаты за пастаўленую прадукцыю. Таму сёння для прадпрыемстваў страхаванне — надзейная «кропка апоры» ў бурлівым моры рынкавых адносінаў, да таго ж патрывожаных штормам крызісу.

**— Яны гэта разумеюць?**

— Разумеюць і ідуць да нас. Мы таксама прыходзім да іх — працэс узаемны.

**— І што канкрэтна вы ім прапануеце ў такой сітуацыі? З дапамогай якога інструмента збіраецеся іх абараняць?**

— Мы прапануем страхаванне экспартных рызык, прычым, што вельмі важна, з падтрымкай дзяржавы! Гэта надзвычай актуальная сёння паслуга для прадпрыемстваў-экспарцёраў тавараў і паслуг. Прадпрыемства, якое заключае знешнегандлёвы кантракт з замежным контрагентам (пакупніком) з адтэрміноўкай плацяжу і набывае наш поліс, можа быць упэўненым, што выручка будзе забяспечана. Калі па нейкай прычыне замежны контрагент з ім не расплаціцца альбо правядзе разлікі несвоечасова, то айчыннае прадпрыемства-экспарцёр атрымае страхавую выплату ад «Белэксімгаранта».

**— У поўным памеры кошту пастаўленага тавару?**

— Дагавор страхавання можа быць заключаны на суму да 100 працэнтаў кошту экспартнага кантракта. Гэта ўсё індывідуальна: гледзячы які кантракт, на які тэрмін і па якім відзе страхавання заключаны. З улікам усіх гэтых абставінаў дзяржава і прадугледжвае гарантаванне выплаты страхавой кампенсацыі.

Калі замежны атрымальнік прадукцыі ці паслуг не змог своечасова расплаціцца з беларускім пастаўшчыком, тады выплату ажыццяўляем мы. І прымаем меры для пагашэння доўгу. Замежны даўжнік потым разлічваецца з намі.

**— А якія ў вас рычагі ўздзеяння, праз каго вы можаце паўплываць на замежнае прадпрыемства, якое завінавацілася?**

— Рычагі розныя. Мы, як правіла, стараемся працаваць праз нашых калег — экспартныя гарантыйныя агенцтвы за мяжой, яны нам дапамагаюць у гэтым выпадку. Выходзім на нашы знешнегандлёвыя прадстаўніцтвы. Ёсць магчымасць уздзейнічаць і праз міжнародны арбітражны суд, але мы ёю не карысталіся ні разу, проста не было патрэбы. Усе запазычаныя сумы вярталі «мірным шляхам».

Прадпрыемства-экспарцёр пад нашым «крылом» адчувае сябе дастаткова камфортна, паступленне страхавой кампенсацыі залічваецца яму як валютная выручка. Прадпрыемства не трапляе пад штрафныя санкцыі з боку дзяржавы, і ў яго ёсць абаротныя сродкі, каб працаваць далей, выпускаць прадукцыю.

**— Вы ўпамянулі пра вашых замежных партнёраў. Чытачу будзе цікава даведацца, хто яны? І наколькі яны надзейныя ў сённяшніх «штармавых» умовах?**

— Гэта перш за ўсё нашы калегі, якія з’яўляюцца членамі Міжнароднага Саюза страхаўшчыкоў крэдытаў і інвестыцый (Бернскі саюз). У яго рамках створаны Пражскі клуб, які аб’ядноўвае краіны Цэнтральнай і Усходняй Еўропы, Азіі. Сюды ўваходзім і мы. Расія і Украіна сёлета таксама падалі заяўкі.

З шэрагам агенцтваў — членаў Бернскага Саюза мы заключылі пагадненні аб супрацоўніцтве. У першую чаргу хацеў бы назваць Польскае гарантыйнае агенцтва «KUKE», а таксама «EGAP» (Чэхія), «MEHIB» (Венгрыя), «EXIMBANK» (Славакія), «Узбекінвест» (Узбекістан) і іншыя.

У нас такая методыка работы: калі ёсць знешнегандлёвы кантракт, мы заключаем дагавор страхавання з нашым прадпрыемствам-экспарцёрам. А для большай надзейнасці, што асабліва важна ў сённяшніх умовах, магчыма перастрахаванне яго ў партнёрскім агенцтве той краіны, куды будзе ажыццяўляцца пастаўка. І ў выпадку зацяжкі з аплатай нам не патрэбна ехаць за «блізкі свет», нашы інтарэсы адстойвае дзелавы партнёр, які прымае ўсе неабходныя меры.

Менавіта так было, калі айчыннае прадпрыемства адгрузіла ў адну з краін Сярэдняй Азіі прадукцыю прыкладна на 70 тысяч долараў, а там існуюць праблемы з канвертацыяй валюты, у выніку чаго наступіў страхавы выпадак. Мы выплацілі прадпрыемству страхавую кампенсацыю ў поўным аб’ёме, а потым правялі работу па суброгацыі праз партнёрскае экспартнае агенцтва. У выніку ўся сума вярнулася ў Рэспубліку Беларусь.

У нас ёсць дамоўленасць з партнёрскімі агенцтвамі на правядзенне стажыровак супрацоўнікаў, абмен вопытам, мы можам атрымаць інфармацыю аб контрагентах з іх краін, — пералік пытанняў, якія можна вырашаць сумеснымі намаганнямі, даволі шырокі.

**— Сёння «Белэксімгарант» аказвае больш за 40 відаў страхавых паслуг…**

— З іх тры — абавязковыя віды страхавання: грамадзянскай адказнасці ўладальнікаў транспартных сродкаў; медыцынскае страхаванне замежных грамадзян, якія часова знаходзяцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь; абавязковае страхаванне грамадзянскай адказнасці перавозчыкаў перад пасажырамі. Астатнія віды страхавання — добраахвотныя.

Для экспарцёраў актуальныя сем відаў страхавання экспартных рызык, прадугледжаныя Указам № 534 Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 25 жніўня 2006 года «Аб садзейнічанні развіццю экспарту тавараў, работ і паслуг». Гэта добраахвотнае страхаванне кароткa-, сярэдне- і доўгатэрміновых экспартных кантрактаў ад палітычных ці камерцыйных рызык; страхаванне рызыкі непагашэння экспартнага крэдыту ці пратэрміноўкі такога крэдыту, выдадзенага банкам-рэзідэнтам Беларусі прадпрыемству-экспарцёру для вытворчасці тавараў ці паслуг; страхаванне інвестыцый беларускіх прадпрыемстваў за мяжой і іншыя. Я назваў толькі асноўныя накірункі, іх поўны пералік прадугледжаны ва ўказе № 534. Калі чытачоў гэты поўны пералік нашых паслуг зацікавіць, мы яго абавязкова прадаставім з улікам той карэкціроўкі дакумента, якая адбылася сёлета. У прыватнасці, карэкціроўка спрасціла працэдуру атрымання прадпрыемствамі-экспарцёрамі крэдыту ў банках, ён выдаецца на льготных умовах, па меншай працэнтнай стаўцы.

**— Хто вашы найбольш вядомыя кліенты ў Беларусі?**

— І БелАЗ, і МАЗ, і трактарны завод, іншыя буйныя (і не толькі буйныя) прадпрыемствы, а таксама айчынныя камерцыйныя банкі. Страхуюць кантракты лікёра-гарэлачныя заводы. І такія пастаўшчыкі касметыкі, як «Беліта», «Вітэкс». Мы сталі надзейнымі партнёрамі для прадпрыемстваў усіх формаў уласнасці. Цікава, што прадпрыемствы, якія пастаўляюць тавары народнага спажывання, у канцы года павялічылі свае «абароты», і лагічным будзе, калі яны праявяць дальнабачнасць і застрахуюць свае пастаўкі па кантрактах.

**— Вы — арганізацыя са стапрацэнтным дзяржаўным капіталам, за вашай спінай стаіць дзяржава. Што гэта азначае на практыцы для вашых кліентаў?**

— Азначае зноў жа стапрацэнтную гарантыю таго, што «Белэксімгарант» цалкам выканае свае абавязацельствы па дагаворах страхавання экспартных рызык. Па-першае, таму, што дастатковы ўласны капітал: сёння ў нас уласны капітал складае больш за 85 мільярдаў беларускіх рублёў. Па-другое, у бюджэце Рэспублікі Беларусь штогод прадугледжваюцца сродкі, якія ў выпадку неабходнасці могуць быць выдзелены «Белэксімгаранту» для выплаты страхавой кампенсацыі нашаму кліенту, прадпрыемству-экспарцёру, якое сустрэлася з праблемамі за мяжой. Пакуль такой магчымасцю мы не карысталіся, стараемся абыходзіцца ўласнымі страхавымі рэзервамі.

Такім чынам, нашы фінансавыя магчымасці дастатковыя, каб прадпрыемства-экспарцёр адчувала сябе ўпэўнена на знешнім рынку.

Страхаваннем экспартных рызык у нас займаецца цэлая служба, дзе працуюць высокакваліфікаваныя спецыялісты. Яны вывучаюць рызыкі для прадпрыемства-экспарцёра, у замежным крэдытным бюро запрошваюць інфармацыю па контрагенце, цікавяцца, хто яго заснавальнікі, знаёмяцца з балансам, ацэньваюць фінансавую ўстойлівасць і плацежаздольнасць. І на аснове аналітычнай ацэнкі прымаецца рашэнне, наколькі кантракт рызыкоўны. Прымаецца пад увагу і тое, якія ў краіне рызыкі — толькі камерцыйныя, ці магчымы і палітычныя, звязаныя з неспрыяльнымі зменамі палітычнай і макраэканамічнай сітуацыі: адбываюцца ўзброеныя канфлікты альбо аб’яўлены нацыяналізацыя ці дэфолт, уводзіцца эмбарга на экспарт і імпарт ці мараторый на абслугоўванне знешняга доўгу і іншае. І прапануем нашаму прадпрыемству-экспарцёру канкрэтныя ўмовы страхавання. Ва ўмовах сённяшняй фінансавай нестабільнасці на міжнародным рынку становішча можа кардынальна змяніцца ў любым рэгіёне, і ў кожным выпадку нашы спецыялісты ўважліва вывучаюць сітуацыю ў поўным аб’ёме па канкрэтнай краіне.



**— Падзяліцеся, калі ласка, планамі на перспектыву.**

— Асноўная наша мэта на перспектыву — актывізацыя аперацый па страхаванні экспартных рызык, нарошчванне аб’ёмаў страхавання. Мы стварылі для гэтага не толькі спецыяльную службу, але і сетку сваіх філіялаў — у кожным абласным цэнтры. Каб быць бліжэй да патэнцыяльных кліентаў.

Мы многае зрабілі для інфармавання патэнцыяльных страхавацеляў. Сёння яны нас пачулі, павярнуліся, што называецца, тварам, зразумелі, што ад нашага страхавога прадукту залежыць іх будучыня. Узаемаразуменню спрыяе і тое, што страхавы поліс недарагі, па кароткатэрміновым кантракце — адзінпаўтара працэнта ад яго цаны.

Мы збіраемся ўдасканальваць сваю дзейнасць, нашы задумкі базіруюцца на задачах, якія паставіў перад «Белэксімгарантам» беларускі ўрад па падтрымцы рэальнага сектара эканомікі. Пры гэтым будзем улічваць міжнародны вопыт экспартных страхавых агенцтваў. Калегі за мяжой у цяперашніх умовах таксама мяняюць формы, стыль і метады работы.

Гэтымі днямі нашы прадстаўнікі вярнуліся з пасяджэння Пражскага клуба ў Братыславе, на якім з удзелам прадстаўнікоў Сусветнага банка вывучалася пытанне, як страхавым кампаніям і экспартным агенцтвам паводзіць сябе ў перыяд сусветнага фінансавага крызісу, як мінімізаваць рызыкі? Згортваць сваю работу ніхто не збіраецца, каб не страціць рынкі збыту. Мы паслухалі калег і зрабілі выснову, што рухаемся ў правільным накірунку. У ходзе пасяджэння падпісаны пагадненні аб супрацоўніцтве «Белэксімгаранта» яшчэ з трыма бюро з еўрапейскіх краін.

**— Вы надзелены выключным правам страхавання экспартных рызык з падтрымкай дзяржавы — ад імя Рэспублікі Беларусь. Гэтая выключнасць дазваляе вам самім устойліва працаваць?**

— У гэтым годзе вынікі фінансава-эканамічнай дзейнасці «Белэксімгаранта» значна вышэйшыя, чым летась. І такая дынаміка прасочваецца штогод. Важнейшыя паказчыкі кожны год паляпшаюцца — і па рэнтабельнасці, і па росце прыбытку, па аб’ёмах і тэмпах росту страхавых паступленняў. Што, у прыватнасці, было асабліва адзначана спецыялістамі рэйтынгавай кампаніі, якая прысвоіла “Белэксімгаранту” міжнародны рэйтынг фінансавай устойлівасці.

Сёлета ў кастрычніку створаная ў нас сістэма падтрымкі нацыянальнага экспарту перацярпела сур’ёзныя змены на падставе таго, што кіраўнік краіны з улікам накопленага вопыту ўнёс змяненні і дапаўненні ў свой ранейшы Указ № 534. Унесены змены і ў шэраг іншых нарматыўных дакументаў. Выдадзена пастанова ўрада і Нацыянальнага банка, якая рэгламентуе парадак экспартнага крэдытавання беларускіх таваравытворцаў. У выніку створана комплексная, больш цэласная сістэма, у рамках якой асноўнае месца адведзена «Белэксімгаранту» як экспартнаму страхавому агенцтву Рэспублікі Беларусь. Арганізацыі, якая абараняе інтарэсы айчынных экспарцёраў на міжнародным рынку. Такі давер акрыляе і да многага абавязвае.

**Карыстаюся выпадкам, каб павіншаваць калег з прафесійным святам. Хай у вас будзе болей кантрактаў і меней страхавых выпадкаў.**

**Публікацыю падрыхтавалі Уладзімір ХІЛЬКЕВІЧ і Вераніка АРЛОЎСКАЯ.**

УНП 101421509

**Рэдакцыя «Звязды» шчыра віншуе свайго даўняга сябра — генеральнага дырэктара Беларускага рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства экспартна-імпартнага страхавання «Белэксімгарант» Вячаслава Дзмітрыевіча БАЛІБОКА з нядаўняй прыемнай падзеяй у яго жыцці і зычыць здароўя, удачлівасці ў рэалізацыі новых, як заўсёды — грандыёзных, задум, а яшчэ — звычайнага чалавечага шчасця.**

**Мы таксама далучаемся да віншаванняў, якія выказаў Вячаслаў Дзмітрыевіч работнікам сістэмы ў сувязі з іх прафесійным святам і просім прыняць самыя добрыя пажаданні ад старэйшага беларускага выдання.**

## «ШАРАВАЯ МАЛАНКА»

**Турнір па боўлінгу сярод журналістаў «Шаравая маланка» прайшоў у 14-ы раз у сталічным боўлінг-цэнтры «Madison».**

У спаборніцтве ўзяла ўдзел 31 каманда. Прадстаўнікі СМІ спачаліся за «Хрустальную кеглю» — пераходны прыз чэмпіёнаў турніру, тэлевізар, ну і, само сабой, за гэтае самае чэмпіёнскае званне.

На трэцім месцы з вынікам 1163 Realt.by, на другім — квартэт «Альфа Радыё» (1171), а чэмпіёнамі турніру сталі журналісты «Теленедели», якія набралі 1199 ачкоў.

Віншуем калег з перамогай і нагадваем, што арганізатарамі турніру выступілі ЗАТ «БелКП-ПРЕСС», «Альфа Радыё» і боўлінг-цэнтр «Madison». Партнёр турніру — Velkom.

15-ы раз «Шаравая маланка» пройдзе вясной наступнага года.

**Кар. «Звязды».**

### ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

**Сканворд + лабірынт (2 снежня). Па гарызанталі:** Гарыла. Тальк. Такыр. «Ася». Лайм. Цаля. Аніс. Мопс. Нява. Румб. Акравак. Тэнт. Асам. Камуз. Астра. Свет. Кокан. Ратару. Атака. Вяз. Афрыка. **Па вертыкалі:** Шпацыр. Акорд. Мста. Ямб. Тува. Рэзерв. Антылопа. Туя. Скот. Зебра. «Ака». Мана. Асот. Ліра. Нявестка. Сліва. Арак. Каня. Сак. Манаграма. **У лабірынце:** 1. Баклажан. 2. Грэйпфрут. 3. Ядловец. 4. Гушчар. 5. Пустазелле. 6. Шыпшына. 7. Памяранец. 8. Бурак. 9. Гарох. 10. Трыцікале. 11. Бавоўна. 12. Хрызантэма. 13. Незабудка. 14. Садавіна. 15. Касцяніка. 16. Нут.

**Сканворд (3 снежня). Па гарызанталі:** Шклянка. Пятніца. Кляп. Баул. Дар. Лава. Сок. Абед. Смык. Лаз. Апора. Азіміна. Хам. Каша. Акын. Валапас. Опера. Сарафан. Храм. Куплет. Вета. Ласт. Канал. Арба. Аматар. Лато. Паз. Гарадок. **Па вертыкалі:** Варатар. Двор. Келіх. Апал. Лема. Ліхтар. Сілас. Адана. Пакт. Арка. Замша. Апала. Луда. Сапёр. Таз. Піяла. Брат. Рым. Сеча. Рог. Пат. Указ. Канава. Сподак. Фен. Шырата. Кубак. Адан. Налíснік.

**Сканворд (4 снежня). Па гарызанталі:** Бязладдзе. Хваля. Кніга. Права. Драга. Стаер. Марс. Рагнеда. Абарот. Рыга. Пастар. Калода. Апарат. Нут. Рыла. Скатка. Эфір. Віза. Суп. Балота. Руіна. Атава. Луг. Аліва. Асада. Аргумент. **Па вертыкалі:** Кентаўр. Прах. Грыфон. Пегас. Арэлі. Тарыф. Амега. Аліса. Ратару. Каса. Паласа. Дыван. Тула. Ікар. Агіда. Залог. Вар. Адрас. Сабака. Паёк. Камар. Аул. Гарызонт. Рарог. Дукат. Стаката. Атлант.


## ВЫПІСВАЙЦЕ «ЗВЯЗДУ» НА I КВАРТАЛ І ПЕРШАЕ ПАЎГОДДЗЕ 2009 ГОДА З БЯСПЛАТНЫМІ ЎКЛАДКАМІ

Насупраць Чарнобылю. Местное самоуправление. Свая справа. Чырвоная змена. Купі лепшае! Жыцьцяндоля. Краіна здароўя.

| | | |
|---|---|---|
| ДЛЯ ІНДЫВІДУАЛЬНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ | 63850 | 10 120 рублёў на месяц<br>30 360 рублёў на квартал<br>60 720 рублёў на паўгоддзе |
| ДЛЯ ВЕТЭРАНАЎ ВАВ І ПЕНСІЯНЕРАЎ | 63145 | 9 570 рублёў на месяц<br>28 710 рублёў на квартал<br>57 420 рублёў на паўгоддзе |
| ДЛЯ ВЕДАМАСНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ | 63858 | 16 170 рублёў на месяц<br>48 510 рублёў на квартал<br>97 020 рублёў на паўгоддзе |
| ВЕДАМАСНАЯ ПАДПІСКА ДЛЯ ЎСТАНОЎ МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ, МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І МІНІСТЭРСТВА АХОВЫ ЗДАРОЎЯ | 63239 | 14 740 рублёў на месяц<br>44 220 рублёў на квартал<br>88 440 рублёў на паўгоддзе |

ПАДПІСКА «ДА ЗАПАТРАБАВАННЯ» (праз кіёскі Мінгарсаюздруку)

| | | |
|---|---|---|
| ДЛЯ ІНДЫВІДУАЛЬНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ | 63850 | 8 690 рублёў на месяц<br>26 070 рублёў на квартал<br>52 140 рублёў на паўгоддзе |
| ДЛЯ ВЕТЭРАНАЎ ВАВ І ПЕНСІЯНЕРАЎ | 63145 | 8 180 рублёў на месяц<br>24 540 рублёў на квартал<br>49 080 рублёў на паўгоддзе |
| ДЛЯ ВЕДАМАСНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ | 63858 | 11 640 рублёў на месяц<br>34 920 рублёў на квартал<br>69 840 рублёў на паўгоддзе |
| ВЕДАМАСНАЯ ПАДПІСКА ДЛЯ ЎСТАНОЎ МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ, МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І МІНІСТЭРСТВА АХОВЫ ЗДАРОЎЯ | 63239 | 11 010 рублёў на месяц<br>33 030 рублёў на квартал<br>66 060 рублёў на паўгоддзе |


## СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.




Віншуем любую матулю, Ганну Іванаўну ГРАМОВІЧ з в. Меляшковічы Мазырскага раёна, з юбілеем.

*Пусть будет жизнь твоя светла,*
*без бед и без напастей.*
*Пусть будет много в ней тепла,*
*цветов, улыбок, счастья.*

**Муж, дзеці, унукі.**

Віншуем нашу дарагую Вольгу ПЛІКУС з днём нараджэння. Жадаем жыццёвага шчасця, моцнага здароўя, новых творчых поспехаў.

**Свёкар Мікалай, свякроў Галіна.** *г. Мінск.*


## ШАШКІ

*Пад рэдакцыяй майстра спорту Мікалая ГРУШЭЎСКАГА*

### 100-ГАДОВАЯ ЗАДАЧА

Менавіта столькі гадоў таму ў «Литературных приложениях» да часопіса «Нива» была змешчана наступная задача 17-гадовага юнака Георгія Чаховіча:



БЕЛЫЯ: b6, d4, f2, f6, g3, g7, дамкі b2, c3, c5, h6, h8 (11). ЧОРНЫЯ: a7, e5, f8 (3).

Замкнуць дамку і простую чорных: 1. cd2 e:a1A 2. hg5 3. de3 4. h:e5 hg1 5. eh2#. Варыянт A1. ...e:e1 пашукайце ў рамках нашага бліца-42/2, пераможца якога будзе адзначаны. Свае адказы накіроўвайце на адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вуліца Б. Хмяльніцкага, 10-а, рубрыка «Шашкі».

«За гэты час так і ніхто не паўтарыў такое спалучэнне фіналаў», — паведамляе гросмайстар СССР Леанід Вітошкін (Гомель). Заадно маэстра прапануе разгледзець і яго новыя эцюды:



№ 1753. БЕЛЫЯ: 7, 29, дамка 35 (3). ЧОРНЫЯ: 25, 26, 39 (3). Змест: 1 (43AB) 30, 48x. A(30) 19 (31) 28 (36C) 44/50, 29-23x. B(31) 30, 26X. C(43) 39, 29 (37) 47x.

№ 1714. БЕЛЫЯ: a7, дамкі f4, h2 (3). ЧОРНЫЯ: b4, c3, c5, h4 (4). Перавага белых. Пераканайцеся ў гэтым самастойна. Таксама будзем рады вашым рашэнням.

### ПЕРШЫНСТВА МОЛАДЗІ

Завяршылася першынство моладзі Беларусі па шашках-100. Майстар Вольга Федаровіч заваявала залаты медаль сярод... юніёраў, праўда, у адсутнасць міжнароднага майстра Андрэя Толчыкава і майстра А. Мацявіна. А ў юніёрак мацнейшай была яе сястра-блізня Дар’я — міжнародны майстар па рускіх шашках.

### АДКАЗЫ, ВОДГУКІ

На заданні класіфікацыйнага конкурсу «Пагода ў доме»-5/1-10, бліцаў-40/3-6 і 41/1-5 правільныя адказы даслалі: В. Талкачоў (в. Уздзевічы Клімавіцкага раёна), І. Астроўскі і А. Сняжкоў (Мінск), Аляксандра Камінская і А. Рогач (Вілейка), У. Бандарык і А. Мацыль (в. Лугавая Слабада Мінскага раёна), У. Сапяжынскі (Рагачоў), А. Кіслы (Узда), І. Козел (в. Махнавічы Мазырскага раёна), К. Козел (в. Ласосна Гродзенскага раёна), В. Голас (Любань), А. Янчук (Камянец), настаўніца Марыя Яўгенаўна Лічко і яе вучні Р. Аль-Корані, К. Рэмез, Дар’я Малашка, А. Жур, А. і А. Яраховічы (в. Возера Узденскага раёна), Дзмітрый Камчыцкі (Магілёў), М. Петух (п/а Зані Мядзельскага раёна), П. Шклудаў (Навапалацк), Л. Вітошкін і інш.

Як абяцалі, апрача аўтарскіх, прыводзім і іншыя развязкі, якія заўважылі нашы вопытныя рашальнікі ў конкурсе «Пагода ў доме»-5: 1. ef8x у заданні № 5 (У. Сапяжынскі, Л. Вітошкін, Д. Камчыцкі, А. Рогач і В. Голас), 5. ... hg3= у заданні № 7 (А. Рогач, Д. Камчыцкі, А. Кіслы, В. Талкачоў, К. Козел, У. Сапяжынскі, П. Шклудаў, Л. Вітошкін і І. Козел). Яны зарабілі дадатковыя ачкі і ўзначальваюць конкурсную табліцу. Што тычыцца сітуацый у партыях (заданне № 9) і пазаконкурсных пазіцыях, пабочныя магчымасці ў іх мы не ўлічваем.

Былы следчы раённай пракуратуры Віктар Талкачоў выказвае падзяку кіраўніку Свіслацкага прадпрыемства жыллёва-камунальнай гаспадаркі Канстанціну Міхайлавічу Барэлю і калектыву, які ён узначальвае, за прызы па выніках конкурсу «Пагода ў доме»-4. А навуковец Іван Астроўскі піша: «Нагогул, у нашай рубрыцы сапраўдная віхура. І чым далей, тым цікавей».


ЗВЯЗДА. БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 7 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 32.333 Індэкс 63850. Зак. № 6782. Нумар падпісаны ў 19.30.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12